Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
20 ЖНІЎНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 158 (28016) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што чакаць ад нашых атлетаў на чэмпіянаце свету?**
СТАР. 5

Сямейная газета



**Як адпачыць на моры з немаўляткам?**



**З танцам па жыцці. І пасля 60-ці**

# СВЯТА З ЯБЛЫЧНЫМ ВОДАРАМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Праваслаўныя вернікі са сталічных мікрараёнаў Серабранка і Чыжоўка ў дзень Праабражэння Гасподняга на святочнай літургіі ў храме прыхода апостала Андрэя Першазваннага свенцяць садавіну. На здымку: Людміла ЖУПРАНСКАЯ з сынам Захарам.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«У многіх краінах Паўночнай Еўропы (Швецыя, Данія, Нарвегія, Фінляндыя) заканадаўча ўстаноўлены абавязковы бацькоўскі адпачынак, так званая квота для тат, і больш за 80% бацькоў выкарыстоўваюць яго. Гэта — дзейсная, добрая мера для фарміравання адказнага бацькоўства, для ўключэння бацькоў у сямейнае жыццё і наладжвання кантакту з дзіцем. Але грамадства павінна саспець да гэтых мер, прыняць такі адпачынак бацькі як жыццёвую норму ў інтарэсах гарманічнага развіцця дзяцей. У пытаннях роўнага ўдзелу ў іх выхаванні важны сустрэчны рух — грамадскіх настрояў і заканадаўчага рэгулявання».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 16 423,00 | ▲ |
| Еўра | 18 198,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 249,93 | ▲ |
| Укр. грыўня | 743,46 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
15158

■ Жыллё маё

## ЯК УТАЙМАВАЦЬ ШУМНЫХ СУСЕДЗЯЎ?

**У шматпавярховіку асабістае жыццё людзей падзяляецца толькі некалькімі метрамі сцен. І з прычыны таго, што ў кожнага чалавека свой распарадак дня і звычкі, часам узнікаюць канфлікты. Іншая справа, калі некаторыя забываюцца пра тое, што яны ў доме жывуць не адны — ладзяць шумныя вечарыны або рамонт у той час, калі іх суседзі спяць. Пра тое, як паводзіць сябе ў такіх сітуацыях, расказаў начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь АКСЦІЛОВІЧ.**

### СОРАК ТЫСЯЧ БЕД ПА АДНЫМ АРТЫКУЛЕ

Свае правы грамадзяне ведаюць і найчасцей забываюцца пра абавязкі. А ў іх уваходзіць выкарыстанне памяшкання згодна з яго мэтамі, захоўванне цішыні ў перыяд з 23 гадзін вечара да 7 раніцы, утрымліванне яго ў чысціні, забеспячэнне падрыхтоўкі свайго жылля да асенне-зімовага перыяду, а таксама эканомны расход вады, газу, электрычнасці і прадастаўленне доступу ў кватэру супрацоўнікам ЖКГ.

«Найчасцей праблемы ўзнікаюць менавіта праз парушэнне спакою з боку шумных суседзяў. Як вядома, з 23 гадзін вечара да 7 раніцы ў жылых памяшканнях павінна захоўвацца цішыня. Аднак гэтае патрабаванне вельмі часта ігнаруецца. Паводле статыстыкі, сёлета за першае паўгоддзе з такой праблемай да нас звярнуліся каля 40 тысяч разоў. Пытанне больш чым «папулярнае». На жаль, далёка не заўсёды грамадзяне ўяўляюць сабе, што жылы шматпавярховік — гэта дом адразу для вялікай колькасці людзей», — расказаў Генадзь Аксціловіч.

Таксама ён удакладніў, што большасць гэтых сітуацый рэгулюецца па-добрасуседску — перамовамі, папярэджаннямі альбо прафілактычнымі гутаркамі з боку камунальнікаў. Аднак так бывае далёка не заўсёды і даводзіцца прымаць пэўныя меры, каб супакоіць суседзяў, якія «пераадольваюць гукавы бар'ер». Ёсць мноства «парад», як гэта зрабіць самастойна. Нямала такіх і ў інтэрнэце. Напрыклад, перад тым, як пайсці на працу, уключыць на максімум музыку на ўвесь дзень або нават запеніць дзверы сваім крыўдзіцелям. Як відаць, большасць з іх неправамерная. Але ёсць і законны шлях — прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці.

«Санкцыя за парушэнне правілаў карыстання — штраф у памеры да 30 базавых велічынь. Сума даволі вялікая», — удакладніў Генадзь Аксціловіч.

Але, як патлумачыў спецыяліст, каб атрымаць такі штраф, трэба вельмі «пастарацца». Звычайна гэта хранічныя выпадкі, калі з месяца ў месяц адны і тыя ж людзі здзяйсняюць бясконцую чараду «шумавых парушэнняў». Судамі, як правіла, найчасцей выкарыстоўваюцца санкцыі ў 10 базавых велічынь.

СТАР. 3

■ Вы чулі?

## СМАЖАНКА — ТОЛЬКІ ДВА РАЗЫ НА ТЫДЗЕНЬ,

### або Як знізіць залішнюю вагу вучняў і... іх партфеляў



**Для прафілактыкі атлусцення беларускіх вучняў у школьных буфетах абмяжуюць продаж сасісак у цесце і смажанак да двух разоў на тыдзень, дзеля зніжэння фізічнай нагрузкі на пазваночнік — зменшаць вагу падручнікаў, а каб выратаваць дзяцей ад сістэматычнага стамлення, прапануюць адмяніць хатнія заданні.**

Партфель сучасных старшакласнікаў лягчэйшы, чым у 5 або 6-класнік, вага ранцаў якіх перавышае нормы на 20-30%. Такія вынікі даследаванняў агучыла на сустрэчы з журналістамі **Ала МАЛАХАВА, загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя:**

— *У апошніх класах вучні дамаўляюцца паміж сабою і носяць адзін падручнік на дваіх, і гэта разумна. Але, на жаль, некаторыя настаўнікі забараняюць такі варыянт, патрабуючы, каб у кожнага было ўсё сваё. Я бачыла, што нават энцыклапедыі дзеці з сабою носяць. Можна дазволіць вучням цягаць з сабой менш, калі, напрыклад, у пачатковай школе пакідаць у класе некаторыя прылады: фарбы, альбомы, кнігі для пазакласнага чытання. Настаўнікі павінны кантраляваць вагу ранцаў, сачыць, што носяць з сабою дзеці. Некаторыя, бывае, і ўчарашні «груз» не выкладаюць з сумак.*

СТАР. 3




■ Парламенцкі дзённік

# ВЫНІКІ ПРАЦЫ — СТАНОЎЧЫЯ

## Місія пасла Індыі ў нашай краіне завяршаецца

**За апошнія гады стасункі паміж Беларуссю і Індыяй выйшлі на новы ўзровень. На гэтым зрабіў акцэнт старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка падчас сустрэчы з паслом Індыі ў нашай краіне Маножам Кумарам Бхарці. Сустрэча была звязана з завяршэннем яго дыпламатычнай місіі.**

Уладзімір Андрэйчанка выказаў шкадаванне наконт гэтага.

— За час вашай працы стасункі паміж Беларуссю і Індыяй выйшлі на якасна новы ўзровень, — адзначыў ён. — Вы зрабілі вялікі асабісты ўнёсак, каб яны мелі такі трывалы і доўгатэрміновы характар.

Спікер Палаты прадстаўнікоў падзякаваў дыпламату за яго працу па актывізацыі палітычнага дыялогу, у тым ліку міжпарламенцкіх стасункаў паміж краінамі, а таксама гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага ўзаемадзеяння.

— Натуральна, вельмі знакавай падзеяй для нас стаў візіт Прэзідэнта Індыі, — заўважыў спікер ніжняй палаты. — Падпісаны шэраг важных дакументаў, якія будуць вызначаць наша далейшае супрацоўніцтва, спадзяюся, на доўгую перспектыву. Таксама ў 2012 годзе адбыўся візіт прэм'ер-міністра Беларусі ў вашу краіну, а ў 2013 годзе — візіт старшыні Народнай палаты парламента Індыі Мейры Кумар да нас.

Уладзімір Андрэйчанка таксама паведаміў, што парламенцкая дэлегацыя нашай краіны плануе наведаць Індыю ў 2016 годзе.

У сваю чаргу індыйскі пасол падзякаваў старшыні Палаты прадстаўнікоў за станоўчую ацэнку сваёй працы. Ён падкрэсліў, што за чатыры гады сваёй місіі ў Беларусі вырас як у асабістым, так і прафесійным плане.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ПЫТАННЕ АСАБЛІВАЙ УВАГІ

## Заканадаўства па арэндным жыллі плануецца дапрацаваць

**Аб гэтым падчас прыёму грамадзян у ААТ «Гродзенскі шклозавод» паведаміў генеральны пракурор Аляксандр Канюк, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

На прыём да генпракурора па тлумачэнні звярнулася супрацоўніца прадпрыемства. Яе цікавілі перспектывы развіцця заканадаўства ў частцы арэнднага жылля. Маладая сям'я пражывае ў блокавым інтэрнаце, стаіць на чарзе як маючая патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, задумваецца аб магчымасці атрымання арэнднага жылля. Але ў выпадку згоды на арэнднае жыллё сям'я выбывае з чаргі маючых патрэбу, губляе правы на атрыманне льготнага крэдыту, адначасова не мае магчымасці калі-небудзь прыватызаваць арандаваную кватэру.

«Так, згодна з заканадаўствам усё ідзе менавіта так. Пытанне прыватызацыі арэнднага жылля вырашана адназначна, выкупляць яго нельга. Аднак я гутарыў з дэпутатамі і ведаю, што яны працуюць над удасканаленнем заканадаўства», — сказаў генпракурор. У прыватнасці, плануецца юрыдычна замацаваць магчымасць перадаваць арэнднае жыллё, умоўна кажучы, па спадчыне, вырашаць пытанні з перадачай правоў арэнды ў выпадку смерці арандатара. «Пытанне патрабуе асаблівай увагі», — згодзен Аляксандр Канюк.

Калі такія працэдуры будуць замацаваны законам, гэта павысіць цікавасць грамадзян да арэнднага жылля. Пакуль многіх спыняюць існуючыя абмежаванні

# ВАЖНЫЯ ТЭМЫ

## У Дзень беларускага пісьменства будзе дадзены старт падрыхтоўцы да 500-годдзя кнігадрукавання

**Аб гэтым сёння на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства ў Шчучыне паведаміла намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Віцэ-прэм'ер азнаёмілася з падрыхтоўкай раённага цэнтра да сустрэчы гасцей свята. Наталля Качанава станоўча ацаніла ход работ. «У Шчучыне абноўлены важныя сацыяльныя, культурныя аб'екты і ў цэлым горад стварае прыемнае ўражанне. Таму вельмі хацелася б, каб выкананае да свята спадабалася і гараджанам, і гасцям горада», — адзначыла яна.

Свята пісьменства ў Шчучыне непарыўна звязана са святкаваннем 70-годдзя Перамогі і Годам моладзі. Акрамя таго, яно стане зыходным пунктам для падрыхтоўкі да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання — юбілейная дата будзе святкавацца ў 2017 годзе. «Гэтыя важныя тэмы знойдуць сваё адлюстраванне на свяце ў Шчучыне — ім будуць прысвечаны экспазіцыі, адпаведна афармлены гандаль», — дадала Наталля Качанава.

На пасяджэнні арганізацыйнага камітэта намеснік прэм'ер-міністра падкрэсліла, што, улічваючы вышэйсказанае, Дзень пісьменства 2015 года павінен прайсці на самым высокім узроўні — як арганізацыйным, так і ў плане насычанай творчай праграмы. Яна даручыла дэталёва прапрацаваць пытанні дастаўкі артыстаў, удзельнікаў і гасцей свята, арганізацыі харчавання і гандлю, работы ўсіх службаў, а таксама канцэртнай праграмы.

Што датычыцца гатоўнасці аб'ектаў будаўніцтва і рэканструкцыі, то яна выказала надзею на тое, што работы будуць завершаны ва ўстаноўленыя тэрміны. Будзе гатовы фасад кінатэатра «Беларусь», дзе праходзіць рэканструкцыя, да Дня пісьменства жыхароў і гасцей горада парадуюць абноўленая бібліятэка, Дом культуры, новы кніжны магазін, адрэстаўрыраваны палац князёў Друцкіх-Любецкіх.

Намеснік прэм'ер-міністра таксама даручыла выканаць максімальна магчымы аб'ём работ па навядзенні парадку ў жылым фондзе, каб нішто не азмрочыла свята для гараджан.

У Шчучыне да Дня беларускага пісьменства адкрыюць першую кнігарню-кавярню, паведаміла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**.

ААТ «Белкніга» павінна адкрыць новы аб'ект у раённым цэнтры да 1 верасня. Крама стане сапраўдным падарункам жыхарам раёна да свята. У ёй будзе шырока прадстаўлена кніжная прадукцыя ў першую чаргу айчынных аўтараў і выдавецтваў. Акрамя таго, Дзень пісьменства ў Шчучыне паслужыў нагодай для адкрыцця ў раённым цэнтры гандлёвага павільёна «Белсаюздрука».

На думку Ліліі Ананіч, з'яўленне двух новых аб'ектаў, звязаных з кнігай і друкам, з'яўляецца знакавым. Шчучын як раённы цэнтр павінен стаць першапраходцам у плане адкрыцця падобных аб'ектаў і ў іншых гарадах. «Сёння асобная кнігарня павінна быць у кожным горадзе краіны, бо кніга — гэты складнік нашай духоўнасці», — лічыць яна.

Па словах міністра, беларускія выдавецтвы ўжо пачалі падрыхтоўку да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое будзе святкавацца ў 2017 годзе. У Шчучыне ў Дзень беларускага пісьменства будзе прадэманстраваны цэлы шэраг выдавецкіх праектаў у сувязі з гэтай датай, гасцям свята будуць прадэманстраваны лепшыя кнігі, якімі Беларусь праслаўлена ў свеце.

Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ: ■ На думку дэпутата

# «У ЧАЛАВЕКА ПАВІННА БЫЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ УТРЫМЛІВАЦЬ СЯБЕ»

## Дзяржава дапаможа працаўладкаваць утрыманцаў лячэбна-працоўных прафілакторыяў

**Працаўладкаваны будуць таксама і асуджаныя, што ўтрымліваюцца ў выпраўленчых установах адкрытага тыпу. Гэта прадугледжваецца пастановай Савета Міністраў №685 ад 14 жніўня 2015 года «Аб зацвярджэнні пераліку мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне працоўнай занятасці асуджаных, якія адбываюць пакаранне ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы, і грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўных прафілакторыях Міністэрства ўнутраных спраў».**

Згодна з пастановай, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы павінны будуць прадастаўляць працоўныя месцы для такіх людзей. Дакумент прадугледжвае развіццё вытворчай кааперацыі паміж установамі крымінальна-выканаўчай сістэмы, ЛПП і арганізацыямі і прадпрыемствамі, дзейнасць якіх каардынуе Міністэрства прамысловасці, а таксама камунальнымі ўнітарнымі прадпрыемствамі, што ствараюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Прадпрыемствы і арганізацыі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку павінны будуць перадаваць на бязвыплатнай аснове тэхналагічнае абсталяванне, якое не выкарыстоўваецца, папраўчым установам і прафілакторыям, зыходзячы з абгрунтаванай патрэбы і фактычнай наяўнасці абсталявання. Адказным за каардынацыю працы па выкананні вышэйназваных мерапрыемстваў стане Міністэрства ўнутраных спраў.

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях** упэўнена, што прыняцце гэтага дакумента сёння неабходна.

— Наколькі гэта мера дзейсная, пакажа час, — заўважыла парламентарый. — Аднак рабіць канкрэтныя крокі ў гэтым кірунку неабходна было ўжо даўно. Асобы, што знаходзяцца ў ЛПП або ўтрымліваюцца ва ўстановах адкрытага тыпу, а значыць, пастаянна там пражываюць, павінны зарабляць сабе на харчаванне, на задавальненне іншых патрэб. Адназначна, іх трэба працаўладкаваць: чалавек павінен мець магчымасць утрымліваць сябе. Паколькі, калі яго ўтрыманне ляжа на яго сям'ю, атрымаецца, што пакараны яго сваякі, а не ён сам.

Пастанова ўрада прадугледжвае, што для такіх людзей будуць рэзерыравацца працоўныя месцы. Наконт таго, што зараз свабодных вакансій вельмі мала, скажу: гэта часова. Такая сітуацыя звязана са зніжэннем пакупніцкай здольнасці суседніх краін, аднак, на маю думку, гэтая праблема паступова вырашыцца. У нас і сёння шмат месцаў, дзе могуць быць створаны новыя працоўныя месцы, у прыватнасці ў сферы паслуг. Пры гэтым іх можна ствараць, не ўкладваючы дадатковых бюджэтных сродкаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Спажывец

# Замежнае — не заўсёды якаснае

## Чаму забаронены ўвоз італьянскага дзіцячага абутку

**Пры правядзенні кантрольных мерапрыемстваў на сталічным прыватным прадпрыемстве «АлешкаКідс» інспекцыяй Джяржстандарта па Мінскай вобласці і г. Мінску выяўлены дзіцячы абутак, выраблены ў Італіі, які не адпавядае патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў (тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы прадукцыі, прызначанай для дзяцей і падлеткаў»).**

«Вытворца ў 1,4 раза перавысіў гранічныя значэнні вышыні абцаса ў абутку для дзяўчынак-школьніц ва ўзросце ад 7 да 12 гадоў. Акрамя гэтага, падкладка з тэкстыльных матэрыялаў у абутку для дзяцей ясельнага ўзросту і дзяцей малога ўзросту была цалкам поліэфірнай. Патрабаваннямі ж ТР МС 007/2011 для такой падкладкі ў вырабах гэтай узроставай групы дапускаецца ўкладанне хімічных валокнаў не больш за 20%. Невыкананне гэтага паказчыка можа выклікаць у дзіцяці алергічную рэакцыю, прывесці да зніжэння гігіенічных уласцівасцей абутку», — растлумачылі ў прэс-службе Джяржстандарта.

У інспекцыі таксама ўдакладнілі, што ў дачыненні да праверанай прадукцыі Дзяржстандартам прынята рашэнне аб спыненні дзеяння на тэрыторыі краіны сертыфікатаў адпаведнасці, выдадзеных органам па сертыфікацыі Расійскай Федэрацыі:

— на серыйны выпуск дзіцячага абутку з маркіроўкай PRIMIGI, вытворца «IMAC Spa Divisione IGI» (Італія);

— на серыйны выпуск дзіцячага абутку з маркіроўкай Missouri, Missouri Kids, MissouriSports, Ermanno Scervino Jounior, Valentina (вытворца «Missouri srl», Італія).

Прыватнаму прадпрыемству «АлешкаКідс» таксама выдадзена прадпісанне на забарону ўвозу і абарачэння гэтай прадукцыі ў нашай краіне.

**Людміла ПАНКОВА, загадчык сектара інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і г. Мінску**, патлумачыла, што спажыўцам варта адказна падыходзіць да выбару дзіцячай прадукцыі, уважліва аглядаць яе перад купляй, вывучаць маркіроўку, цікавіцца ў прадаўца характарыстыкамі выбару, якіх вытворцам або пастаўшчыком, а таксама пацвярджэннем адпаведнасці. Пры наяўнасці сумненняў ад набыцця такога тавару лепш адмовіцца.

**Дар'я ШОЦІК**

# ПАРАДАК НА ВЫБАРАХ БУДЗЕ ЗАБЯСПЕЧАНЫ

**Да выбараў Прэзідэнта засталося не так і шмат — крыху больш за паўтара месяца. І да гэтай адказнай падзеі трэба належным чынам падрыхтавацца.**

— Рашэннем міністра ўнутраных спраў зацверджаны комплекс мерапрыемстваў, якія будуць рэалізоўвацца падчас далейшага ходу выбарчай кампаніі, — паведаміў **начальнік упраўлення аховы правапарадку Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Дзмітрый КУР'ЯН**. — З 5 па 12 кастрычніка міліцыя і ўнутраныя войскі будуць пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Разгорнецца і кругласутачны аператыўна-сітуацыйны штаб. Выбарчыя ўчасткі возьмуць пад круглясутачную ахову, як толькі туды паступяць бюлетэні. Мы гатовы да развіцця любой сітуацыі, якая можа ўскладніць становішча, адэкватна адрэагаваць на яе. Пакуль жа можна падвесці прамежкавыя вынікі выбарчай кампаніі. Яна праходзіць у спакойным і стабільным рэчышчы.

Па традыцыі прагаласаваць можна будзе датэрмінова. Аднак ёсць месцы, дзе зрабіць гэта не атрымаецца. Сярод іх — медыцынскія ўстановы.

— Галасаванне ў нас праводзіцца толькі ў асноўны дзень, — зазначыў **начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай абароны пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег ПАНЧУК**. — Як правіла, на ўчастках у бальніцах яно заканчваецца рана. Часам інфармацыя па тых, хто прагаласаваў, з'яўляецца нават апоўдні. Зразумела, калі дазволіць стан здароўя і пратаколы аказання медыцынскай дапамогі, пацыентаў будуць прыкладна за тыдзень адпускаць дадому. Але ж людзі паступаюць у бальніцы штодня. І тыя, хто 11 кастрычніка застанецца ў стацыянарах, змогуць прагаласаваць на ўнутраных участках, якія будуць створаны пры кожнай бальніцы. Кудысьці перавозіць пацыентаў не будзе патрэбна.

Яшчэ адзін важны складнік парадку на выбарчых участках — гэта процілажарная бяспека.

— Мы загадзя распрацавалі адмысловы комплекс мер, — гаворыць **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір СУВОРАЎ**. — Складаецца ён з двух блокаў. Адзін з іх скіраваны на максімальную арганізацыю прафілактычнай працы, другі ж — на ўзмацненне службы. На выбарчых участках падрыхтуецца дзяжурства нашых супрацоўнікаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Экалогія

# Наша паветра іспыт вытрымала

## Пажары на ўкраінскай частцы чарнобыльскай зоны, працяглая жнівеньская спёка і адсутнасць ападкаў не нанеслі сур'ёзнай шкоды беларускай прыродзе і здароўю насельніцтва

**Так на пытанне аднаго з чытачоў «Звязды» адказаў падчас «прамой лініі» нашай газеты міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Андрэй КАЎХУТА.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Па словах міністра, на тэрыторыі Беларусі сапраўды ўзніклі ўмовы, спрыяльныя для назапашвання забруджвальных рэчываў у прыземным слоі паветра. У Мінску быў зафіксаваны істотны рост (у 1,5-2 разы) канцэнтрацый цвёрдых часціц. Забруджванне паветра цвёрдымі часціцамі, прыземным азонам і фармальдэгідам назіралася і ў абласных цэнтрах краіны. Але, нягледзячы на гэта, перавышэння нарматыўнай чысціні паветра зафіксавана не было.

Каб зменшыць нагрузку на здароўе насельніцтва, прымаліся неабходныя меры — апавяшчэнне мясцовых улад для прыняцця рашэнняў, папярэджанне прадпрыемстваў пра неабходнасць рэгулявання выкідаў забруджвальных рэчываў, распрацоўка рэкамендацый для насельніцтва і камунальных службаў, напрыклад, мыццё асфальту і іншыя спосабы ўвільгатнення паветра.

— На шчасце, сур'ёзнай небяспекі для здароўя людзей гэтая сітуацыя не выклікала, — адзначыў Андрэй Каўхута. — А што датычыцца пажараў у чарнобыльскай зоне, то праблема знаходзіцца пад пастаянным кантролем усіх службаў краіны, у тым ліку і Гідрамета. І, па інфармацыі спецыялістаў, павелічэння радыяцыйнага фону па-за межамі зоны адчужэння не ўстаноўлена.

Адказы на іншыя пытанні «прамой лініі» чытайце ў наступным нумары экалагічнага дадатку «Звязды» «Карані і кроны».

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

# ЯК УТАЙМАВАЦЬ ШУМНЫХ СУСЕДЗЯЎ?

## ЯК ЖА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЦІ?



Каб супакоіць буйнага суседа, ёсць два правераныя часам спосабы. У першым выпадку выклікаецца міліцыя, якая прымае заяву. Магчыма, што супрацоўнікі міліцыі трапяць у кватэру суседзяў, каб правесці з імі гутарку. Далей міліцыянеры накіруюць дакументы ў ЖЭС. Тут вельмі важна, каб віна правапарушальніка была даказаная, і тое, што ён апавешчаны аб усіх сваіх правах як удзельнік адміністрацыйнага працэсу. Пасля гэтага ЖЭС фарміруе працэсуальны пакет дакументаў, які павінен быць у судзе. Збіраюць іх у тэрмін ад двух тыдняў да месяца.

«Чаму так доўга? Таму, што віна правапарушальніка даказваецца толькі паказаннямі сведак. Напрыклад, гукапіс не паказвае, адкуль даносіцца шум. Відэазапіс таксама не дапаможа, пакуль вы, вядома, не трапіце ў кватэру суседзяў у момант правапарушэння. Таму ў гэтым выпадку адзіным доказам з'яўляюцца паказанні сведак. ЖЭС у такім выпадку апытвае ўсіх вашых найбліжэйшых суседзяў. І на гэтым этапе ўзнікаюць пэўныя складанасці. Напрыклад, з прычыны добрасуседскіх адносін хтосьці не захоча даваць паказанні ў судзе. Хранічных правапарушальнікаў не заўсёды лёгка азнаёміць з матэрыяламі справы, што неабходна для суда», — растлумачыў Генадзь Аксіловіч.

Цяпер ёсць такая мера, як прыцягненне праз органы ўнутраных спраў для падрыхтоўкі ўсіх неабходных дакументаў для ўдзелу ў адміністрацыйным працэсе. Але і гэта часта не спрашчае справу. Бо ёсць тэрмін, на працягу якога можна прыцягнуць парушальніка спакою да адказнасці. Ён складае 3 месяцы з моманту выяўлення правіннасці. Далучаючы іншыя органы, гэты тэрмін можна прапусціць. Вось і атрымліваецца, што праз усе гэтыя ўмоўнасці толькі каля 5% парушальнікаў (з 40 тысяч зваротаў) сапраўды адкажуць перад законам. Другі спосаб — звярнуцца непасрэдна ў ЖЭС. Пры гэтым рэкамендавана, каб з вамі былі сведкі, якія пацвердзяць вашы словы. Пажадана яшчэ падчас напісання заявы пазначыць, калі супрацоўнікам ЖЭСа прыйсці да іх для апытання. Гэта значна паскорыць ход падзей. Можна таксама паспрабаваць запрасіць суседак да сябе ў кватэру, калі вашы суседзі з'ехалі ў адпачынак. Варта памятаць, што асноўная праблема — даказаць правапарушэнне.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*

■ Інавацыі

# НА КАНЦЭРТ — ПА «МАБІЛЬНЫМ» КВІТКУ

**9 верасня ў краіне стартуе новы сэрвіс «СМС-Білет» — зручнае набыццё квіткоў на рознага кшталту мерапрыемствы, як абяцаюць яго распрацоўшчыкі. Першапачаткова такім чынам можна будзе замовіць квіткі на тэатральныя пастаноўкі, спектаклі, канцэрты. У перспектыве гэты спіс плануецца папоўніць кінапаказамі, лекцыямі, майстар-класамі. Білеты не трэба будзе раздрукоўваць ці забіраць у касе.**

Набыты на сайце smsbilet.by квіток будзе прыходзіць карыстальніку на мабільны тэлефон у выглядзе СМС-паведамлення, якое трэба будзе паказаць пры ўваходзе ў глядзельную залу. Апошнія будуць абсталяваны сучаснымі стацыянарнымі і партатыўнымі сканерамі для праверкі квіткоў. Аплаціць у інтэрнэце пакупку можна любым зручным спосабам. СМС-білет звязаны з нумарам мабільнага тэлефона, які ўказваецца пры замове, таму яго лёгка вярнуць, немагчыма забыць дома, а таксама зручна перадаць сябрам, адправіўшы ім СМС-паведамленне.

Па сцвярджэнні распрацоўшчыкаў, высокатэхналагічны сэрвіс ужо ацанілі арганізатары буйных карпаратыўных мерапрыемстваў, бо цяпер няма неабходнасці прыдумваць і раздрукоўваць для сваіх гасцей білеты ці бэйджы. Дастаткова толькі адправіць СМС-паведамленні.

Запуск праекта адбудзецца на фестывалі «Рок на вакацыях», які пройдзе 9 верасня ў клубе «Сябры». Наступным мерапрыемствам, на якое таксама можна набыць білеты такім чынам, — запланаваны канцэрт расійскага рэп-выканаўцы L'ONE, што адбудзецца 30 верасня ў Prime Hall. Усім тым, хто скарыстаецца новым сэрвісам для набыцця білетаў на гэтыя мерапрыемствы, абяцаны ў падарунак музычныя кампактдыск з рэдкімі запісамі найлепшай беларускай музыкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# СМАЖАНКА — ТОЛЬКІ ДВА РАЗЫ НА ТЫДЗЕНЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

І ўсё ж дзякуючы прафілактыцы колькасць выпадкаў парушэння пастаці і зроку ў дзяцей ад 0 да 17 гадоў зменшылася ў параўнанні з лічбамі папярэдняга года на 5,6% і 9,6% адпаведна. Зніжаецца і лічбы захворванняў крывяторных органаў і сістэмы кровазвароту, псіхічных расстройстваў. Аднак не здае пазіцыі сумная і трывожная тэндэнцыя росту сярод школьнікаў праблем атлусцення, цукровага дыябету II тыпу (прыбаўка праз залішнюю вагу), хвароб вачэй і вушэй, органаў дыхання. Гэта выклікана не толькі няправільным харчаваннем, але і меншай рухомасцю школяроў, працяглым «зявісаннем» у камп'ютарах. Завышаны таксама патрабаванні навучальнай праграмы.

*— Вучэбная нагрузка апераджае псіхалагічную падрыхтаванасць да яе школьніка на 1-1,5 года. Гэта адбылося ў сувязі з пераводам дзяцей на навучанне з шасці, а не з сямі гадоў, пачаткам вывучэння асобных прадметаў (фізіка, хімія, матэматыка) з меншага ўзросту і ўсталяваннем 5-дзённага школьнага тыдня. Агульная колькасць вучэбных гадзін пры гэтым паменшылася, але ж павялічылася штодзённая нагрузка. Сем урокаў цяпер бывае нават у школьнікаў сярэдніх класаў, — канстатуе спецыяліст. — У такіх умовах адмена хатніх заданняў павінна быць першачарговай задачай міністэрства адукацыі.*

Неабходна перагледзець і складаны змест сучасных падручнікаў, з прычыны якога школьнікі вывучаюць прадметы з дапамогай бацькоў. Акрамя таго, патрэбна пільна сачыць за выкананнем графіка кантрольных, якіх праз пераносы можа быць па дзве на дзень.

**Ірына СІДАРОК.**

■ Будзь у курсе!

# ПА ПЕРШАЕ ЧЫСЛО

## З 25 жніўня нацыянальны аператар «Белтэлекам» змяніў правілы ўнясення платы абанентамі за паслугі электрасувязі

**Тэрміны змяняюцца ў сувязі з уступленнем у сілу пастановы Савета Міністраў №589 ад 13 чэрвеня «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Правілы аказання паслуг электрасувязі».**

У іх указана, што абаненцкая плата за бягучы месяц уносіцца не пазней за 1-е число наступнага месяца. Плата за мясцовыя, міжгароднія і міжнародныя тэлефонныя злучэнні, а таксама іншыя паслугі электрасувязі ўносіцца не пазней за 1-е число месяца, які ідзе за месяцам выстаўлення платы за аказаныя паслугі электрасувязі.

Новыя правілы пачнуць дзейнічаць з 25 жніўня. Калі абанент не згодны з імі, то ў тэрмін да 18 верасня ён павінен накіраваць аператару пісьмовае паведамленне, якое будзе расцэньвацца як адмова ад дагавора на аказанне паслуг электрасувязі. Тыя ж, хто аплаціць выстаўлены рахунак, будуць лічыцца згоднымі на заключэнне дадатковага пагаднення да дзеючага дагавора.

Нагадаем, што раней рахункі за тэлефон і інтэрнэт трэба было аплачваць да 25-га числа.



# ПАЛЯВАННЕ ЗНОЎ ПЕРАНОСІЦЦА

**Сёлета пачатак палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну ўжо пераносіўся ў сувязі з анамальнымі ўмовамі надвор'я — з 8 на 22 жніўня. Аднак і ў гэтую суботу ахвотныя не змогуць расчахліць свае стрэльбы.**

Як паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі, з прычыны спякотнага сухога надвор'я і з мэтай папярэджання выпадкаў узнікнення лясных пажараў яно выступіла з ініцыятывай перанесці пачатак палявання ў чарговы раз. Ініцыятыва была ўзгоднена з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Прынята распараджэнне прэм'ер-міністра аб пераносе адкрыцця сезона палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну, вальдшнэпа, вехіра, шэрага голуба, перапёлку, фазана на 5 верасня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Разважанні пра сучаснасць

# «ГІСТАРЫЧНЫМ ПОМНІКАМ ПАТРЭБНА ПРАВІЛЬНАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ АХОВА»

**Якая менавіта? Пра гэта гутарка з доктарам юрыдычных навук Ігарам МАРТЫНЕНКАМ**

**Ігар Эдуардавіч прыйшоў у юрыдычную прафесію пасля службы ў арміі. Скончыўшы факультэт правазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, 14 гадоў праслужыў у органах пракуратуры. У 1997 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю і, дарэчы, быў тады адзіным у Беларусі пракурорскім работнікам з вучонай ступенню. У сувязі з гэтым пазней перайшоў на работу ў «купалаўскі» ўніверсітэт, якому патрабаваліся юрысты-практыкі. Сёлета пасля абароны другой дысертацыі яму прысуджана вучоная ступень доктара юрыдычных навук — дыплом, які пацвярджае гэты высокі навуковы статус, уручыў кіраўнік дзяржавы.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

*12 гадоў Ігар Мартыненка ўзначальвае кафедру грамадзянскага права і працэсу на юрыдычным факультэце ГрДУ імя Янкі Купалы. Аўтар каля 270 навуковых артыкулаў, якія друкаваліся ў пятнаццаці краінах, шэрагу манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. Менавіта яго даследаванні паклалі пачатак фарміраванню новага кірунку ў юрыдычнай навуцы: абарона гісторыка-культурнай спадчыны як праваахоўная дзейнасць.*

***— Ігар Эдуардавіч, чаму менавіта ахова гісторыка-культурнай спадчыны стала прыярытэтнай сферай навуковых інтарэсаў?***

— Гэтай праблемай займаюся ўжо 20 гадоў, матэрыял для даследаванняў збіраў па ўсім свеце. Выязджаў у камандзіроўкі і працаваў у судовых, праваахоўных, кантралюючых органах краін СНД. Вывучыў фактычна ўсе справы, што заводзіліся ў Беларусі за перыяд яе незалежнасці. У ГрДУ імя Янкі Купалы сабрана ўнікальная практыка па прымяненні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, якая ўключае матэрыялы крымінальных і адміністрацыйных спраў, акты пракурорскага рэагавання, іскавыя патрабаванні, статыстычныя звесткі. Гэтая база пастаянна папаўняецца.

Сістэмна бачыць праблемы ў гэтай сферы мне самым непасрэдным чынам дапамог вопыт пракурорскага работніка. Яшчэ напачатку 1990-х гадоў, разглядаючы скаргу грамадзян накont самавольнай прыбудовы да іх дома, выявіў шматлікія парушэнні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Тады ўдалося прыцягнуць да адказнасці шэраг службовых асоб. Таксама прад'явілі першы ў Беларусі іск (дарэчы, да сёння адзіны) аб кампенсацыі страт, прычыненых гісторыка-культурнай каштоўнасці — комплекснаму помніку горадабудаўніцтва «Гістарычны цэнтр Гродна».

Былі і іншыя пракурорскія праверкі. Напрыканцы 1990-х давялося займацца былым домам купца Мураўёва. Як здарылася, што гістарычны помнік у цэнтры горада аказаўся фактычна безгаспадарным? Дайшло да таго, што ў гэтым будынку, з якога выехала абласная бібліятэка, людзьмі без пэўнага месца жыхарства нават вогнішчы разводзіліся... Справа не абмяжоўвалася толькі крытычнымі артыкуламі ў «Гродзенскай праўдзе» і «Звяздзе». Па матэрыялах праверкі завялі крымінальную справу, былі ўнесены прадстаўленні ў шэраг дзяржаўных органаў, у тым ліку міністру культуры Беларусі. Асабіста дакладваў аб выніках праверкі на пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры. Прынцыповая пазіцыя пракуратуры дазволіла захаваць будынак ад канчатковага разбурэння.

***— Аднак нядаўна на пасяджэнні грамадскага Савета пры пракуроры Гродзенскай вобласці ён зноў называўся сярод праблемных. Зацягваецца тэрміны рэканструкцыі. На пачатку мінулага года з даху ўкралі элемент гістарычнага аб'екта — парапет, які, верагодна, зацікавіў зламыснікаў каляровым сплавам медзі. Толькі пасля пракурорскага прадстаўлення ўласнік аб'екта забяспечыў яго кругласутачнай аховай, але нядаўна зноў выявілі яе адсутнасць. Чаму такім шматпакутным аказаўся лёс гэтага гістарычнага помніка?***

— Статус і стан былога будынка Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага (менавіта так раней ён называўся) — праблема набалелая. Час ужо і ўладу прымяніць. Міністэрства культуры, органы мясцовага кіравання павінны прыняць узгодненае рашэнне, як і за якія сродкі адрэстаўраваць будынак, як забяспечыць захаванасць існуючых элементаў дэкору, што тут будзе размяшчацца. У мяне ў памяці засталіся печы, кафля, лепка. Удалося знайсці архіўныя дакументы, прасачыць эвалюцыю аб'екта, абгрунтаваць неабходнасць яго захавання і пакараць вінаватых. Зараз неабходна знайсці крыніцы фінансавання рамонтна-аднаўленчых работ на гэтым помніку архітэктуры і горадабудаўніцтва, выкарыстаць механізм дзяржаўна-прыватнага партнёрства. І, зразумела, патрэбны кантроль (не толькі дзяржаўны, але і грамадскі) за правядзеннем работ, навуковае суправаджэнне праекта.

***— Наступны прыклад — з Брэстчыны. У вёсцы Малыя Мурыны Камянецкага раёна разабралі драўляную царкву XVIII стагоддзя, якая з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Прадугледжана аднавіць будынак, які быў далёка не ў найлепшым тэхнічным стане. Аднак ці ў праваным рэчышчы гэта робіцца?***

— Па гэтым факце ўзнікае пытанне: што за від работ на гісторыка-культурным помніку — разборка? Законам ён не прадугледжаны. А калі так, што гэта за «аднаўленне» помніка шляхам яго разборкі? Ці не адбываецца тут замена гістарычнага аб'екта на муляж? І ці будзе новы аб'ект тым жа «разабраным» помнікам? Напэўна, не. Трэба больш асцярожна ставіцца да аўтэнтычнасці помнікаў. У любым выпадку патрабуецца прававая ацэнка дзеянняў па разборцы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

**Лічу, што ў Беларусі павінен быць сфарміраваны спіс асабліва значных гісторыка-культурных каштоўнасцей, які зацвярджаецца Прэзідэнтам.**

***— Ігар Эдуардавіч, чакаецца, што неўзабаве ў Беларусі будзе прыняты Кодэкс аб культуры...***

— Гэта першы вопыт кадыфікацыі сферы заканадаўства аб культуры, сур'ёзны крок па ўпарадкаванні існуючых нарматыўных прававых актаў. Кодэкс мае перад імі безумоўныя перавагі, бо дазволіць сістэмна і лагічна аб'яднаць увесь заканадаўчы масіў. І, разам з тым, максімальна скараціць колькасць актаў і адсылачных нормаў. З прыняццем Кодэкса аб культуры спыніецца дзеянне шэрагу законаў, у тым ліку «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь». Асноўныя яго палажэнні і іншых законаў увойдуць у гэты кодэкс. У выніку яго нормы прамога дзеяння будуць рэгуляваць адпаведныя грамадскія адносіны без іх канкрэтызацыі ў іншых актах.

***— Ці ўсе аспекты ў дачыненні да прававой аховы аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ўлічаны пры падрыхтоўцы кодэкса?***

— Мяркуючы па праекце, не. На маю думку, не зусім удала вырашаецца пытанне дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей. З гэтым заўсёды былі праблемы: выклікае сумненне дакладнасць прынятых на ўлік помнікаў, асабліва археалогіі, дзяржспіс не апублікаваны. Згодна з праектам кодэкса, статус помніка, які ахоўваецца законам, будзе надавацца Міністэрствам культуры, а не ўрадам, як цяпер. Лічу, што ў Беларусі павінен быць сфарміраваны спіс асабліва значных гісторыка-культурных каштоўнасцей, які зацвярджаецца Прэзідэнтам.

Праблемнае пытанне — ахова археалагічнай спадчыны. У прыватнасці, даўно адстойваю ідэю далучэння Беларусі да Канвенцыі ЮНЕСКА «Аб ахове падводнай культурнай спадчыны», каб выкарыстаць інструменты, якія прапанаваны ў гэтым міжнародным пагадненні. Аднак чамусьці пераважае меркаванне, што Беларусь не марская дзяржава. Прабачце, а хіба ж не з'яўляюцца нашай культурнай (археалагічнай) спадчынай судны, лятальныя апараты, зброя, што затанулі ў рэках і іншых вадаёмах? Альбо старадаўнія пахаванні і скарбы ў вадзе, тыя ж стаянкі (паселішчы на насцілах)...

**Трэба больш асцярожна ставіцца да аўтэнтычнасці помнікаў.**

Акрамя таго, варта ўвесці адказнасць за несанкцыянаванае прымяненне металашукальнікаў, чаго сёння няма. Трэба забараніць грамадзянска-прававыя здзелкі з археалагічнымі прадметамі. Неабходна дакладна прапісаць пытанні ўласнасці на помнікі археалогіі. І ўвогуле вызначыць, хто такія археолаг, археалагічная экспедыцыя.

Мяркую, што трэба дакладна вызначыць паняцце аўтэнтычнасці як прынцып захавання спадчыны. Чаму мы хочам набыць менавіта сапраўдную карціну? Таму што да яе дакраналася рука майстра. Дык чаму ж тады пасля рэканструкцыі, здараецца, з цяжкасцю можна распазнаць помнік? Бо яго адрэстаўравалі «лепш, чым было».

Спадзяюся, што гэтыя і іншыя пытанні будуць заканадаўча адлюстраваны ў Кодэксе аб культуры. Не застанецца ўбаку і наш універсітэт. З 1 верасня на юрыдычным факультэце ўпершыню ў Беларусі пачнём выкладаць аднайменны спецкурс. Будзем знаёміць студэнтаў не толькі з асаблівасцямі айчыннага і міжнароднага заканадаўства ў гэтай сферы, але і навучым іх падрыхтоўцы працэсуальных дакументаў, напрыклад, падачы іскавых заяў у суд па кампенсацыі страт, прычыненых гісторыка-культурнаму аб'екту.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*



■ Прыёмная кампанія — 2015

## ЮРЫСПРУДЭНЦЫЯ НЕ ЗДАЕ ПАЗІЦЫІ

**Юрыдычны каледж Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падвёў вынікі ўступнай кампаніі.**

У гэтым годзе дакументы на ўсе формы навучання сюды падалі 498 чалавек, а залічана было 195 навучэнцаў. З іх на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі на аснове базавай адукацыі былі залічаны 25 чалавек. Конкурс сярод прэтэндэнтаў склаў 6,4 чалавека на месца, а прахадны бал — 9,5 (у 2014-м — 9,3).

На дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі на аснове сярэдняй адукацыі залічана таксама 25 чалавек. Конкурс склаў 3,1 чалавека на месца. Прахадны бал — 16,8.

На завочную бюджэтную форму прынята 15 вучняў. Конкурс для іх склаў 1,5 чалавека на месца. Прахадны бал — 12,6.

На дзённую платную форму атрымання адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі было пададзена 118 заяў. Навучацца тут будуць 75 чалавек. Такім чынам на адно месца было зарэгістравана 1,6 прэтэндэнта. Прахадны бал склаў 8,3.

На дзённую платную форму атрымання адукацыі на аснове сярэдняй адукацыі з 42 ахвотных у Юрыдычны каледж прынята 25 чалавек. Конкурс склаў 1,7 чалавека на месца. Для навучання на платнай форме абітурыентам неабходна было набраць не менш як 13,6 бала.

На завочную платную форму навучання залічана яшчэ 30 чалавек. Тут утварыўся конкурс 2,5 чалавека на месца (у 2014 годзе быў 1,5). Прахадны бал — 7,6.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ спаДАРОЖНІК

## ПРЫЦЯГАЛЬНЫ МАРШРУТ НА ВАРШАВУ

**Беларуская чыгунка прапрацоўвае для пасажыраў новы лагістычны маршрут з Мінска ў Варшаву праз Гродна. Разам з польскімі калегамі яго плануюць адкрыць у снежні.**

У выніку дамоўленасці маршрут цягніка Гродна — Беласток — Малкінія будзе падоўжаны да Варшавы. Плануецца, што ён будзе адпраўляцца з Гродна ў Польшчу ў 7.06 і прыбываць у Беласток у 8.02, у Малкінію — у 9.40, у Варшаву — у 11.29. У прэс-цэнтры магістралі распавялі, што мяркуемы графік руху дазволіць арганізаваць зручную перасадку пасажыраў на станцыі Гродна пры руху ў Польшчу з цягнікоў міжрэгіянальных ліній №№ 631, 609, 623, 634, якія звязваюць Гродна з Мінскам, Гомелем, Магілёвам, Віцебскам.

Зручная лагістыка прадугледжана і ў зваротным кірунку. Цягнік будзе адпраўляцца з Варшавы ў 6.26 і прыбываць у Гродна ў 14.20, што дазволіць пасажырам далей у 15.25 адпраўляцца ў Мінск, у 16.53 — у Маскву, Віцебск ці Магілёў, у 17.18 — у Санкт-Пецярбург, Баранавічы ці Гомель.

На інфармацыі польскага боку, на маршруце Гродна — Варшава тамтэйшыя калегі нашых чыгуначнікаў плануюць задзейнічаць сучасны маторвагонны рухомы састаў. Каб павысіць канкурэнтаздольнасць перавозак, таксама плануецца ўвесці фіксаваны кошт праезду на цягніках па гэтым маршруце. Рэалізацыя праекта заклікана садзейнічаць павышэнню прыцягальнасці чыгуначных пасажырскіх перавозак у міжнародных зносінах і развіццю турыстычных маршрутаў.

### Май на ўвазе!

У верасні Беларуская чыгунка чакае свайго мільённага інтэрнэт-пасажыра. Такі прагноз зроблены з улікам павелічэння попыту на продаж білетаў праз сеціва.

— Павелічэнню рэалізацыі праязных дакументаў праз інтэрнэт садзейнічае работа, якую Беларуская чыгунка праводзіць па ўдасканаленні сістэмы продажу. Дзякуючы спрашчэнню аплаты білетаў па банкаўскім плацежным картам праз інтэрнэт і стварэнню сэрвісу «Адзін клік» за студзень—ліпень такой паслугай ужо скарысталіся больш за 800 тысяч чалавек. Гэта сведчыць аб яе папулярнасці, — распавялі ў прэс-цэнтры магістралі. — Беларуская чыгунка раіць усім пасажырам паспрабаваць стаць шчаслівым уладальнікам мільённага білета, набытага праз інтэрнэт, і будзе рада ўручыць мільённаму інтэрнэт-пасажыру іменны сертыфікат, што пацвердзіць яго статус, і падарунак.

**Да ведама**

*Цяпер пасажыры могуць аплачваць білеты па банкаўскім карткам Visa, Visa Electron, MasterCard, Maestro любога банка свету, а таксама карткамі сістэмы БЕЛКАРТ.*

*Беларуская чыгунка ажыццяўляе плацяжы за праязныя дакументы з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных карт, выпушчаных банкамі: Расіі, Літвы, Украіны, Латвіі, Германіі, Ізраіля, Вялікабрытаніі, Італіі, Польшчы, ЗША, Францыі, Швецыі і іншых краін.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 13 (36)



## ЛУЖЫНА СТРАХУ

У дзяцінстве я была далёка не з баязлівага дзясятку. Ведала пра непазбежнасць пакарання, але працягвала ўцякаць па канавах да цёці Клавы, каб пакатацца на УАЗіку. Цішком арудавала нажніцамі на галаве п'янага суседа Славіка, пакуль той спаў (пасля чаго з яго прычоскі смяялася ўся вёска). Тым не менш у мяне ўсё ж такі быў адзін моцны страх. Я баялася прасіць прабачэння. Што толькі ні рабілі бацькі — і ўпрошвалі, і крычалі, і нават папруга ішла ў ход, але сказаць «даруйце» ўслых для мяне было страшнейшым за смерць.

На днях зачапіў за жывое абразок Лідзіі Арабей: «У час Вялікай Айчыннай вайны загінуў кожны чацвёрты беларус. Сёння кожны чацвёрты беларус гіне ад гарэлкі». Але ж бяда, калі задумацца, мае значна большыя маштабы. Побач з алкаголікамі гадамі жывуць-пакутуюць-«страчваюць сябе-гінуць» іх непітушчыя жонкі.

Нядаўна сяброўка распавяла гісторыю, у якую цяжка паверыць. Тым не менш... Бацька яе аднакласніцы «злоўжываў». Прычым, што далей, то болей. Маці ўвесь гэты час трывала. Хоць і разумела, пэўна, што адзінота ўдваіх — гэта страшна. Але ў глыбіні душы спадзявалася, што муж возьмецца за розум. Ды і дзяцей было шкада. Толькі калі дачка стварыла сваю сям'ю, адважылася і падала на развод. І неўзабаве... здарыўся цуд. У такіх выпадках кажуць: не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Без «нянькі» яе былы муж дапіўся да таго, што ў адзін цудоўны дзень яго, ледзь жывога, забралі на «хуткай». Урачы сказалі, што калі будзе працягваць, пражыве не больш за месяц. Ён, відаць, вельмі спужаўся, бо цяпер і грама той атруты ў рот не бярэ. Жонка прыняла яго назад. Цяпер жывуць душа ў душу, падарожнічаюць. Вось нядаўна з Італіі вярнуліся...

Гэтая жанчына — адна з нямногіх жонак алкаголікаў, хто рызыкнуў разарваць заганнае кола. Большасць жа працягвае жыць у пастаянным страху: баяцца застацца адны і замест таго, каб шукаць магчымасці, шукаюць апраўданні. «А куды ж я пайду?» «А што людзі скажуць?» «Ён жа без мяне прападзе...» Пры гэтым не разумеюць, што робяць горш не толькі сабе, але і яму. Застаюцца нянькай для мужа-алкаголіка, які мала таго, што не зарабляе грошы, дык і прапівае жончыны. Ён, відаць, добра засвоіў, што чалавекам, які баіцца, маніпуляваць прасцей за ўсё.

А жанчына працягвае наракаць на свой лёс і падпарадкоўвацца... А пасля здзіўляецца, адкуль на яе сыплюцца тыя хваробы... «Нікому ж нічога благога не зрабіла», — пры гэтым сябе ў разлік не бярэ, бо яна, як асоба, даўно ўжо растварылася ў мужы і дзецях. У народзе кажуць, што ўсе хваробы — праз нервы. Але карміная медыцына лічыць, што людзі хварэюць з прычыны ўласных страхаў. Нездарма яшчэ Фрэнсіс Бэкан казаў: «Няма нічога страшнейшага за сам страх!»

Свой дзіцячы страх, які блакаваў і перашкаджаў развівацца, я, на шчасце, пераадолела. Зазірнуць яму ў вочы дапамог... звычайны сабака. Аднойчы я ішла некуды і звярнула ўвагу на дварняка, які стаяў на краі лужыны. Ён хацеў піць. Але толькі нахінецца, як бачыць сваё адлюстраванне. І ў сполаху адскоквае, бо думае, што гэта іншы сабака. Але ў рэшце рэшт смага перамагла страх, і ён з разгону скокнуў у лужыну. І адлюстраванне знікла. Убачыўшы гэта, я зразумела, што перашкодай паміж мной і страхам была я сама. І, як толькі зразумела, перашкода знікла...

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■ Насуперак стэрэатыпам

# НА МОРА З НЕМАЎЛЯТКАМ? ЛЁГКА!

## МАЛАДАЯ МАЦІ ПАДЗЯЛІЛАСЯ ВОПЫТАМ ПЕРШАГА АДПАЧЫНКУ ЗА МЯЖОЙ З АДЗІНАЦЦАЦІМЕСЯЧНАЙ ДАЧКОЙ

**Галоўнае патрабаванне да краіны — мінімальная акліматызацыя для дачушкі. Таму Балтыка, па нашым уяўленні, стала ідэальным варыянтам для першага сумеснага адпачынку. І сапраўды, адзінаццацімесячная Ганулька адчувала сябе тут даволі камфортна, быццам мы нікуды не з'язджалі. Але марское паветра разам з сасновым (у літоўскай Паланзе вельмі шмат хвоі) медыкі ацэньваюць як найлепшую прафілактыку захворванняў у будучыні. Гэта мы праверым крыху пазней, але такі аргумент быў адным з вырашальных.**



На Балтыйскі бераг рушылі на сваёй машыне. Сто семдзесят кіламетраў — і мы на беларуска-літоўскай мяжы. Прыемна, што пад першы шлагбаум з маленькімі дзецьмі прапускаюць без чаргі (трэба паказаць пашпарт малечы). Такім чынам мы апярэдзілі восем машын. І як вынік — перасеклі мяжу за рэкордныя 50 хвілін! На жаль, калі вярталіся на радзіму, давялося адстаяць каля чатырох гадзін: літоўскі бок прапускае з маленькімі дзецьмі толькі грамадзян Еўрасаюза.

Яшчэ адзін момант, які трэба запланаваць, — працягласць адпачынку. У ідэале для маленькіх дзяцей рэкамендуюць чым больш, тым лепш. Нам давялося адпачыць два тыдні. Думалі, што гэта доўга, але час праляцеў незаўважна!

### ШТО БРАЦЬ?

**ДАКУМЕНТЫ.** Для выезду за мяжу нават месячнай малечы патрэбны пашпарт. Робіцца ён для дзетак бясплатна. Але цэлы месяц. Калі тэрмінова — удвая хутчэй, толькі трэба будзе заплаціць адну базавую. Віза ў пасольстве таксама робіцца бясплатна, як і медыцынская страхоўка.

**АПТЭЧКА.** Мы па рэкамендацыі адправіліся да нашага педыятра. Але, калі вандруеце на Балтыку, набор лекаў не адрозніваецца ад стандартнага набору, які заўсёды павінен быць пад рукой матулі. Прасцей кажучы, ад тэмпературы, ад атручвання, ад укусаў камароў. Мы яшчэ прыхапілі бінт і пластыры, тэрмометр, дзіцячыя сродкі для і пасля загару. Закінулі з сабой лекі ад насмарку і болю ў горле. Але, безумоўна, калі едзеш у цывілізаванае месца, дзе ёсць аптэка, браць з сабой усё неабавязкова.

**АДЗЕННЕ.** Адразу трэба адзначыць, што надвор'е на Балтыцы — не самае прадказальнае, таму нам спатрэбіліся цёплыя рэчы, а вось прыгожыя купальнікі засталіся ў чамаданах. Абавязковы аксесуар на адпачынку — парасон і накідка на каляску. На пляж прыхапіце палатку ці вялікі парасон, каб хавацца ад ветру: на жаль, у дзюнах месца ўсім не хапае. Калі нешта з гэтага вы забыліся — можна ў крокавай даступнасці лёгка набыць любую рэч на любы густ ці з'ездзіць у суседні горад Клайпеду, дзе рэчы таннейшыя.

**СРОДКІ ГІГІЕНЫ.** Памперсы мы вырашылі браць з вялікім запасам і... палову прывезлі назад. Вядома, купіць іх можна і на месцы, праўда, кошт будзе крыху вышэйшы. Некаторыя вілы прапануюць не толькі дзіцячыя ложкі (яны могуць выдавацца платна ці бясплатна ў залежнасці ад гаспадароў), крэслы для кармлення, але нават і гаршкі. Гэта трэба ўдакладняць загадзя, каб не цягнуць непатрэбныя рэчы.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

■ Паспець усё!

# РАНІЦАЙ — ГАСПАДЫНЯ, УВЕЧАРЫ — БІЗНЕС-ВУМЕН

**Шматдзетная маці, паспяховая прадпрымальніца і чароўная жанчына. Першую палову дня Кацярына Сінкевіч завіхаецца па гаспадарцы і займаецца са сваімі траімі дзецьмі, пасля абеду яна пераўвасабляецца ў бізнес-вумен і на ўласным прыкладзе даказвае, што сумяшчаць працу і сям'ю зусім не складана — было б памкненне і жаданне.**

### Вы — не дрэва

Па адукацыі Кацярына — выкладчык рускай, беларускай і англійскай моў, скончыла дзённую аспірантуру, але не абараніла дысертацыю, бо ўжо тады была не гатова жыць на сродкі, што прапаноўвала навука. Спачатку працавала ў школе, сумяшчала асноўны занятак з сеткавым маркетынгам. Калі пачала атрымліваць стабільна высокі дадатковы заробак, звольнілася і ўсю ўвагу стала аддаваць будаўніцтву кар'еры ў фірме, дарасла да звання дырэктара, працягвала павышаць званні і паляпшаць сваё становішча. Менавіта з ростам дабрабыту яны з мужам вырашылі, што могуць не проста дазволіць сабе шмат дзяцей, але і забяспечыць ім якаснае жыццё.

— *У нашай краіне шмат магчымасцей зарабляць грошы,* — упэўнена жанчына, — *толькі гультай зараз не робіць гэтага. Вы не дрэва, якое пасадзілі на адным месцы, дзе яно і змагаецца за існаванне. Кожны можа звольніцца з працы, якая яго не задавальняе, можа змяніць кваліфікацыю. На дзелавых сустрэчах заўжды кажу: не шкадуйце людзей — многім выгадна рабіць з сябе няшчасных і слабых. Калісьці дала сабе ўстаноўку: я ўсё змагу, і мне шанцуе. Так пачала прыцягваць да сябе пазітыўныя падзеі. Я вельмі мэтанакіраваная і ўпэўнена, што калі б засталася ў школе, то зараз ўжо дакладна была б завучам, а ў раённай установе — дырэктарам.*

### Я — не квактуха

Кацярына выйшла замуж у 25 гадоў і першапачаткова, па савецкай традыцыі, думала аб дваіх дзецях: хлопчыку і дзяўчынцы. Так у сям'і з'явіліся Глеб і Уладзіслаў. Нарадзіць яшчэ адно дзіця захацелася, калі стала больш грошай, з'явілася ўласнае жыллё і жаданне вылучыцца з асяроддзя сваіх знаёмых, дзе не было шматдзетных матуль. Да таго ж, як жартуе жанчына, хацелася мець дачку, бо тады дакладна будзеш упэўнена, што з'явяцца ўнукі. Дарэчы, Сінкевічы не выключаюць, што з часам у сям'і можа з'явіцца яшчэ адно немаўля.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*



Кацярына заўжды пры прычосцы і макіяжы.

■ Нататкі таткі



# ПРОСТЫЯ СЛОВЫ

**Як вы лічыце: колькі слоў чалавеку неабходна ведаць, каб дасягнуць паразумення з іншымі людзьмі? У Дастаеўскага і Талстога слоўнікавы запас быў больш за пяць тысяч, у Элачкі Людаедкі з «12 крэслаў» — не больш за трыццаць слоў. У маёй дачкі, якой толькі год і пяць месяцаў, ён складае пакуль каля 35 слоў і 6 імёнаў. Тым не менш гэтага хапае, каб з лёгкасцю патлумачыць, што ёй неабходна.**

Увогуле, з таго моманту, як дзіця пачынае мэтанакіравана вымаўляць розныя словы, у жыцці бацькоў пачынаецца новы цікавы перыяд. Па-першае, ты з радасцю разумееш, што ў доме гучыць голас (не крык і не плач) яго новага паўнапраўнага жыхара. Па-другое, кожнае новае слова — гэта заўсёды цэлая гісторыя. Толькі паспяваў запамінаць, пры якіх абставінах нарадзіўся новы перл. Па-трэцяе, ты, безумоўна, чакаеш, калі з гэтых маленькіх пухленькіх вуснаў зляцяць самае дарагое для цябе слова. Тваё.

Размаўляць з малой я пачаў з таго самага моманту, як толькі даведаўся, што Віка цяжарная. Кожны вечар клаўся ля жывата жонкі і абавязкова распавядаў дачцэ ўсе галоўныя навіны, жадаў добрай ночы. Калі Васіліса з'явілася на свет, нашы размовы сталі больш актыўнымі. Мы з Вікай пачалі тлумачыць усё, што адбываецца навокал, словамі абазначалі сябе, родных і ўсе рэчы. Калі заставаўся з дачкой сам-насам, то вучыў яе гаварыць «тата». Старанна вымаўляў яго па складах, цягнуў кожную літару. Вельмі хацелася, каб менавіта гэтае слова стала яе першым, але мае намаганні пацярпелі фіяска. У сем з хвосцікам месяцаў дачка паклікала «маму».

Са светлай зайздрасцю дзень за днём я чакаў сваёй шчаслівай хвіліны, і яна прыйшла нечакана. Неяк вечарам мы пілі гарбату ў прыкуску з перацёртымі з цукрам клубніцамі. Малая ў гэты час курсіравала ўздоўж канапы, кожную хвіліну прыцэльваючыся да нашых прысмакаў. Праз боязь магчымай ангіны і алергіі ёй паласаваца ягадамі не давалі. Спробы «падмануць» сушкай ці пернікам не праходзілі. Яна хацела таго, што ядуць бацькі. Малая бубнела, паказвала пальчыкам на талерку, клянчыла «ма-ма-ма». Калі, відаць, увесь запас просьбаў быў вычарпаны, яна паглядзела на мяне, перавяла позірк на клубніцы, потым — зноў на мяне і жаласліва прамовіла «та-та». У гэты вечар, 24 лістапада, я ўпершыню пачуў, як маё дзіця называе мяне татам, а дачка ўпершыню пакаштавала клубніцы.

З таго моманту слоўнікавы запас Васілісы значна пашырыўся. Мы паспяхова асвоілі «бабу», «дзедзю», «цёцю», «дзядзю». Цікава, але пры фармаванні свайго слоўнікавага запасу дачка карыстаецца не толькі меркантыльным інтарэсам. Хутчэй, наадварот. З усіх слоў толькі некалькі маюць практычны характар — «ням-ням», што азначае працэс ужывання ежы і самі прысмакі, «тапта» — так яна называе абутак і нагадвае, што надышоў час прагулкі на вуліцу, «буб» — так яна просіць набыць ёй булку. Астатнія словы ў большасці сваёй звязаны з лецішчам, на якім мы праводзім большасць вольнага часу. Яна выдатна ведае, што калі ўсе разам «бру-бру» ў машыне, то едзем на «дацю», дзе жывуць яе сябры: «аў», «по-по-по» (куры), «мяў», «бадзя-бадзя» (козы) і, безумоўна, «іго-го», на якім яна так любіць «тацца» (катацца). Па дарозе на лецішча ўважліва ўсё разглядае і каментуе: вунь паехаў «сі апф» (сіні аўтобус), а за ім — «тата» (трактар), на полі «му» робіць «ням-ням».

Вядома, кожнае слова ў выкананні дзіцяці выклікае ўсмешку. Часам смешна бывае і ад таго, як яна разумее асобныя выразы. Забягаючы наперад, скажу: мы ніколі не ўжываем у адносінах да дачкі слоў з негатыўнай афарбоўкай, не называем яе дрэннай ці шкадлівай. Калі ёсць патрэба, гаворым, што яна зрабіла дрэнны ўчынак ці так робяць толькі дрэнныя дзяўчынкі, а яна, Васіліса, — харошая. Нягледзячы на гэта, малая хутка ўцяміла: большасць таго, што цікава ёй, — «дрэнны ўчынак», а быць харошай — нецікава. Таму на пытанні «Васіліса, ты — харошая? Васіліса, ты — прыгожая? яна ўмомант выдасць: «Аць» (не). Станоўчы адказ у пераліку характарыстык атрымліваеш, толькі калі запытаешся: «Ты дрэнная?» Што ж тут зробіш: хіба што пацалуеш са словамі «Ты наша харошая»...

Як і ў большасці дзяцей, словаформы Васілісы ўтвораны шляхам скарачэння ці ўвогуле ўяўляюць з сябе толькі першыя літары. Але ёсць і такія, паходжанне якіх для нас застаецца незразумелым. Напрыклад, словы «ўпаў» і «разбіўся» ў яе выкананні гучаць проста як «ап». Імя дзеда Васі яна спрасціла да «Адзя», а сябе заве не Васіліса, а «Абба». Такіх выразаў, якія абавязкова патрабуюць перакладу, у лексіконе дачкі таксама хапае, але, што цікава, у нас, у бацькоў, яны ніколі не выклікаюць цяжкасцяў. Літаральна на першых гуках мы адразу здагадваемся, аб чым ідзе гаворка, што ёй неабходна. Магчыма, усё таму, што паразуменне дасягаецца не тысячай слоў, а нараджаецца ў сэрцы...

**Аляксандр АЛЕСІК**

■

# РАНІЦАЙ — ГАСПАДЫНЯ, УВЕЧАРЫ — БІЗНЕС-ВУМЕН

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Цяжарнасць Кацярына пераносіла з лёгкасцю, адразу пасля родаў заўсёды вярталася да працы:

*— Атрымліваю задавальненне ад працэсу працы. Я не мама-квактуха, якая трасецца над дзецьмі, я бяру іх з сабою, і мы разам ідзём займацца бізнесам. Зразумела, што эканоміць час і ўсюды паспяваць вельмі дапамагае машына, без яе ніяк. Здаралася, на сустрэчах некаторыя нават не заўважалі, што ў мяне пад паланцінам спіць і п'е малако немаўля, а мне было вельмі зручна. Але аддаваць увесь свой час дзецям таксама няправільна, бо атрымаецца, што мы жывём іх жыццём і забываемся на сябе.*

У выхаванні дзяцей сям'і Сінкевічаў вельмі дапамагала добрая знаёмая Кацярыны, якая стала нянькай, калі старэйшаму споўнілася 11 месяцаў. Да догляду другога сына яна таксама далучылася, калі Уладзіку было каля года. Зараз сям'я пераехала ў іншы раён Мінска, куды нянька прыязджаць ужо не можа. Дзяцей яны даглядаюць па чарзе з мужам, бо найбліжэйшыя сваякі — у Віцебскай вобласці.

*— Вельмі важна ўмець дамаўляцца з мужам, — кажа Кацярына. — Мая палова — вельмі адэкватны чалавек, які падтрымлівае мяне ва ўсім, мы працуем па чарзе, бывае, на працу аддаеш і суткі, і ён усё разумее. Мова і посуд памыць, і абед згатаваць, і дзяцей на гурткі адвесці. Асабіста мне хатняя завіханні ўвогуле задавальнення не прыносяць, і я ўсё часцей думаю запрасіць каго-небудзь на дапамогу. Тады і на дзяцей больш часу застанецца.*

## Дзеці — мае партнёры

Дзеці ў Кацярыны спакойныя, заўсёды могуць самі заняць сябе гульнёй. Аднак адной генетыкі для такога выніку мала:

*— З самага дзяцінства я прывіваю дзецям таварыскасць. Кажуць, што калі да двух месяцаў не прывучыць малечу да чужых людзей, то потым будзе цяжка чакаць ад яе камунікабельнасці. З першых жа дзён я не звяртала ўвагі ні на якія вірусы і давала патрымаць сваіх немаўлят усім, з кім мела стасункі. Хацела, каб з дзецьмі пагаварылі ласкавым голасам, паўсміхаліся ім, каб малыя зразумелі, што гэты свет бяспечны, а іншыя людзі — такія ж нармальныя, як і бацькі. Затое ў маіх дзяцей ніколі не было істэрык, калі мне трэба было адлучыцца. Калі матуля займае пазіцыю, што ёй вельмі цяжка з дзіцем і яна нічога не можа рабіць, так яно і будзе, бо ўсе нашы беды ідуць ад галавы. Але калі накіраваць думкі ў добрае рэчышча, то заўсёды можна знайсці людзей (суседзяў, бабуль), якія нават за дзякуй ці за ежу пасядзяць з вашым малым і дадуць маці магчымасць нешта зрабіць.*

Для сваіх сыноў Кацярына пачынала шукаць заняткі, калі ім не было яшчэ і года. Старэйшы зараз займаецца ў мадэльнай школе, ходзіць на бальна-спартыўныя і сучасныя танцы і плаванне, вывучае камп'ютарную графіку і англійскую мову. Пры неабходнасці ён сам пяройдзе дарогу і зробіць пакупкі ў краме. Сярэдні сын Уладзік хадзіў у школу ранняга развіцця і, пайшоўшы ў дзіцячы садок, захапіўся сучаснымі танцамі.



Сям'я Сінкевічаў — дзяцей шмат не бывае.

*— Я звяртаюся да сваіх дзяцей як да партнёраў, стасункі ў нас на роўных, таму яны і растуць самастойнымі, —* упэўнена Кацярына.

У адносінах з дзецьмі жанчына практыкуе не толькі самастойнасць, але і ўласны прыклад. Яна заўжды пры прычосцы і макіяжы, што стала ўжо стылем жыцця:

*— Я проста не магу сабе дазволіць выглядаць дрэнна, нават выносячы смецце буду добра апранута і расчасана. Гэта пазіцыя дагледжанай жанчыны. Сыны будуць шукаць у жонкі падобных нявест, а для дачкі я проста буду прыкладам для пераймання.*

## Дыягназ не праблема

Нараджэнне дачкі з прыроджанай глухатой сям'я Сінкевіч успрыняла без істэрык і слёз. Калі Адэліне было 4 месяцы, Кацярына западозрыла, што нешта не так, і павезла немаўля на абследаванне. Даведаўшыся пра дыягназ, стала шукаць магчымасці вырашыць праблему:

*— Успрыняла гэтую сітуацыю як дадзенасць, паўплываць на якую ў той момант я не магла. Не крычала, чаму менавіта я і за што. Лічу: калі праблема вырашаецца за грошы, то гэта не праблема.*

Адэліна стала самай юнай беларускай, якой зрабілі аперацыю па вяртанні слыху — дзяўчынку прааперыравалі ў лютым гэтага года, калі ёй было толькі восем месяцаў. Каб трапіць на стол хірурга так рана, Кацярына з 6 месяцаў спецыяльна адкормлівала дачку, каб набраць неабходныя для аперацыі 10 кілаграмаў.

*— У Еўропе народжанаму глухім немаўляці аперацыю робяць адразу, у Чэхіі — з двух гадоў, калі ўжо ёсць рэакцыя на гук. Я спяшалася правесці працэдуру як мага раней, каб дачка змагла адаптавацца і пайсці ў звычайны садок і школу, —* тлумачыць жанчына.

Калі пра праблему Сінкевічаў даведалася калега Кацярыны — Кацярына Цімахавец, яна прапанавала дапамагчы купіць маўленчы працэсар (неновы апарат каштуе $3500) і нават знайшла праз сацыяльныя сеткі людзей, гатовых прывезці яго з Амерыкі, але на яго бацькі дзяўчынкі і самі маглі зарабіць у найбліжэйшы час. А вось аперацыя на другое вуха ($26500) патрэбна была тэрмінова, каб дасягнуць найлепшага поспеху з вяртаннем слыху, а такія грошы здабыць адразу не атрымлівалася:

*— Рэанімаваць другое вуха можна было б і ў Беларусі (на адно вуха працэдура бясплатная, на другое — за грошы), але ж у нас ставяць апараты яшчэ не апошняга пакалення, таму мы і паехалі за мяжу. Хачу, каб мая дачка нічым не адрознівалася ад іншых дзяцей. Я не бачу вялікай розніцы паміж тым, носіш ты акуляры ці апарат для слыху.*

Аперацыю Адэліне, якой нядаўна споўніўся годзік, рабілі ў канцы чэрвеня ўжо ў Польшчы. Сродкі на гэта дапамог сабраць знаёмы Кацярыны Цімахавец, прыватны дабрадзей, юрыст Яўген Бейзак, які ведае праблему слыху знутры і ўжо дапамог не адной сям'і ў такім становішчы. Даведаўшыся пра гісторыю Сінкевічаў, ён і арганізацыі, з якімі супрацоўнічае юрыст, літаральна за некалькі месяцаў змаглі назбіраць патрэбную суму.

*— Гэта такое шчасце, калі тваё дзіця чуе цябе і гаворыць з табой. Я вельмі ўдзячна, што ў нашым свеце ёсць людзі, неабыякавыя да чужых праблем, нізкі паклон Кацярыне, Яўгену і іншым за дапамогу і падарунак Адэлі, — дзякуе шчаслівая маці. — Я вырашыла таксама дапамагаць, чым змагу, людзям, якія трапілі ў падобныя сітуацыі.*

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота з сямейнага архіва.**

■ Маміны дзённікі



Ганначка за сняданкам:

— Мама, ты ўсміхаешся так, як быццам хочаш замуж!

* * *

— Мама, а для Бога Вялікдзень — гэта таксама вялікае свята?

* * *

— Мама, я табе для таго, каб працягваць сябра, — кажа мне дачка вечарам проста так.

— Дашуль, якога сябра?

— Мам, вось у цябе на працы ёсць сябар?

— Ёсць, Воля.

— Вось а дома гэтай Волі няма, я і кажу, што я — каб працягнуць твайго сябра.

* * *

Даша прапануе мне выпіць з цацачнага кубка нібыта малако.

Ганначка сядзіць за сталом і працягвае сапраўдны кубак: «Мам, можа сапраўднай какавы лепш?» На што Даша адказвае: «Мама, пі маё малако. Ганначчына — сапраўднае, а маё — карыснае!»

* * *

— Мама, вось я на нешта гляджу цяпер, але гэтага не відаць. Адгадай, на што? — інтрыгуе Ганначка.

— ...Нават не ведаю, што сказаць.

— Не можаш сказаць, таму што гэтага не відаць. Гэта радасць, якую мы прынеслі ў дом, калі прыйшлі!

* * *

— Мама, уключы мне зноў мульцік.

— Дашачка, ты ўжо паглядзела мульцік. Давай ужо збірацца.

— Мама, давай будзем лічыць, што мульцік — мая праца. Мне трэба дапрацаваць.

* * *

Ганулька:

— Мама, а што ў птушкі самае важнае?

— Пэўна, крылы.

— Не крылы, а сэрца! Як яна з мёртвым сэрцам, скажы, будзе лётаць?

* * *

Едзем у аўтобусе. Трымаю Дашу на руках. Ганначка трымаецца сама і нас аддзяляе чалавек, яна мяне не бачыць. Праязджаем адзін прыпынак, выходзім.

Ганулька:

— Мама, мне так спадабалася.

— Што менавіта?

— Ну, я была ў аўтобусе як быццам адна.

— Табе спадабалася быць адной?

— Не, мне было крышачку страшна і крышачку нястрашна. Вось гэтае «крышачку нястрашна» мне спадабалася.

**Запісала мінчанка Наталля СЯЛЕЦКАЯ**

■

# НА МОРА З НЕМАЎЛЯТКАМ...


Тактыльны заапарк.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**ЕЖА.** З сабой мы ўзялі тэрмахаладзільнік, куды закінулі нашы ёгурты і дзіцячы кефірчык. Дарэчы, менавіта аб апошнім дачка вельмі сумавала — беларускі скончыўся хутка, а за мяжой такога не знайсці. Дзіцячыя пюрэшкі і морсікі мы таксама вырашылі прыхапіць з сабой, але... Менавіта на адпачынку пакаштавалі вялікую колькасць ягад і фруктаў, што набывалі на рынку. Маліны, чарніцы, персікі і абрыкосы, чарэшня... Гэтыя прысмакі малая ела нават з большым задавальненнем, чым «гатовае» са слоічкаў.

У рэстаранах і кавярнях нам заўсёды прапаноўвалі дзіцячыя крэселкі. Ёсць там і адмысловае меню для малечы, але гэта, у асноўным, фры і сасіскі. Калі вы валодаеце англійскай мовай, можна смела папрасіць прыгатаваць супчык без спецый, напрыклад.

## ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ

Безумоўна, мора. Паплаваць, магчыма, і не давядзецца, а вось пакапацца ў вялікай белай пясочніцы — для дзетак адно задавальненне. Недалёка ад мора ў Палангзе пабудавалі цудоўную дзіцячую пляцоўку — на некалькі гадзін занятак малым забяспечаны.

Яшчэ адзін добры сямейны рэлакс — катанне на веласіпедах. Іх можна ўзяць на пракат амаль на кожным вуглу. Для дзетак выдаюцца спецыяльныя крэслы і шлемы. Таму калі малечы падабаецца доўга сядзець — гэта цудоўная магчымасць пракаціцца ўздоўж берага. Кошт пракату веласіпеда — 2 еўра ў суткі, з крэслам — тры.

Яшчэ адно цудоўнае месца — вялікі Батанічны сад, дзе знаходзіцца і музей бурштыну. На тэрыторыі саду шмат птушак, асабліва качак і лебедзяў, якія з задавальненнем ідуць амаль у рукі, калі бачаць батон. А калі хочацца пазнаёміць малечу з рознымі жывёламі, то за восем кіламетраў ад саду знаходзіцца цудоўны комплекс, дзе за сімвалічныя пяцьдзясят цэнтаў можна наведаць заапарк. І не толькі наведаць, бо ён тактыльны! Гэта значыць, усіх жывёлаў можна карміць і гладзіць! Маленькія баранчыкі і трусікі вельмі захапілі не толькі нашу дачушку, але і тату.


Вось такі кантраст — у байках і плаўках.

За трыццаць кіламетраў ад Палангі можна наведаць марскі музей (на жаль, гэтым летам ён на рэканструкцыі) і шоу дэльфінаў. Гадавалых дзетак, напэўна, такое відовішча не захопіць, а вось старэйшыя малыя, як і бацькі, будуць у захапленні.

Высновa, да якой мы прыйшлі пасля адпачынку, — не баяцца. Бо менавіта ў паездках дзеткі максімальна развіваюцца, усё ўпітваюць. Гэта мы праверылі асабіста, пацвярджаем!

**Марына СІДАРОВІЧ.**
**Фота аўтара.**


Намёты ад халоднага балтыйскага ветру.

■ Ёсць пытанне

# ПЛЯСКАЧ ЯК ХУТКАЯ ДАПАМОГА

## Выхоўвай дзіця, пакуль яно ляжыць упоперак лаўкі

**Час ад часу даводзіцца бачыць такую карціну: дзіця разрываецца ў істэрыцы ад слёз. Толькі што мама дала яму пляскача па ўсім вядомай мяккай частцы цела. Малое вярнулася на «зямлю», але прызямленне аказалася эмацыянальна адмоўным. У такія моманты, з аднаго боку, імкнешся апраўдаць маці, а з іншага — шкадуеш дзіця. І як да гэтага ставіцца? З такім пытаннем мы звярнуліся да <u>практыкуючага перынатальнага псіхолага Кацярыны ШАВЯЛЁВАЙ</u>:**

— Спрадвеку ва ўзаемаадносінах з дзіцем выкарыстоўвалася фізічнае пакаранне. Маецца на ўвазе не біццё ці гвалт, якое забаранецца законам, а, напрыклад, пляскач па попе. Насамрэч, яго нават нельга назваць метадам выхавання. Тут можна правесці аналогію з захворваннем. Калі ў нас катар — мы карыстаемся спецыяльнымі кроплямі. Калі гэта ангіна, то трэба звяртацца да лекаў, якія больш моцна дзейнічаюць. Калі стан сапраўды цяжкі і крытычны — выклікаем хуткую дапамогу. Мы не робім гэта кожны дзень, па дробязі, ці калі можам справіцца з хваробай самастойна. Дапамога патрэбна зараз, у гэтую хвіліну, калі нішто іншае ўжо не працуе. Калі мы разумеем, што той пляскач — адзінае адэкватнае выйсце ў дадзены момант.

Тыя, у каго ёсць дзеці, прыхільнікі ці праціўнікі фізічнага пакарання, верагодна, падпішуцца пад словамі, што ў выключных выпадках нельга абысціся без жорсткіх мер. Гэта бывае неабходна для здароўя і бяспекі самога дзіцяці. Самае галоўнае — не злоўжываць сілай, дараванай нам прыродай. Калі пастаянна вырашаць канфліктныя сітуацыі з дапамогай біцця, то з цягам часу адчувальнасць да таго, што добра і што дрэнна, у дзіцяці губляецца.

У любым выпадку пакаранне павінна адпавядаць сітуацыі. Напрыклад, мама і малы сядзяць у пясочніцы. Дзіця спакойна гуляецца. І раптам пачынае абсыпаць пяском тых, хто сядзіць побач з ім. Ён не разумее, што шкодзіць іншым, ды і кантраляваць сябе цалкам яшчэ не можа, маміных слоў і тлумачэнняў не чуе, стандартныя сродкі пакарання не дзейнічаюць. Тут пляскач па попе, магчыма, апраўданая рэакцыя мамы, але...

У славянскай народнай сістэме выхавання ёсць такая прыказка: «Выхоўвай дзіця, пакуль яно ляжыць упоперак лаўкі». Людзі і раней разумелі, што без фізічнага пакарання абысціся не атрымаецца, але рабіць гэта трэба, пакуль дзіця маленькае. Напрыклад, як можна шлёпнуць 16-гадовага падлетка? У той жа час на дзіця 5-6 гадоў пляскач падзейнічае павучальна. А ў дачыненні да маленькіх да 3 гадоў лепей увогуле гэтага не прымяняць, бо іх можна траўміраваць. Трэба адцягнуць увагу дзіцяці, зацікавіць чымсьці іншым, ці, у той жа сітуацыі з пясочніцай, узяць яго на рукі і сысці.

Справа ў тым, што ў першыя гады жыцця яшчэ маленькі чалавек успрымае свет на архаічных узроўнях дотыкаў і эмоцый. І часам дзеці сапраўды не асэнсоўваюць словы ў адрозненне ад дарослых, якія да ўсяго могуць дайсці розумам. У школьнікаў ужо развіваецца лагічнае, крытычнае мысленне, яны (асабліва ў падлеткавым узросце) пачынаюць замыкацца, хаваць свае пачуцці. Гэта той момант, калі ўпоперак лаўкі дзіця ўжо не пакладзеш. Нашы продкі дзяцей ва ўзросце пубертату каралі ў выключных выпадках: калі парушаліся агульначалавечыя каштоўнасці. Гэта магло быць нешанаванне бацькоў, замах на жыццё ці здароўе іншага чалавека. Таму для падлетка, калі ён зусім разышоўся і не кантралюе сябе, нават адзін намёк на тое, што яго могуць ударыць, астудзіць усе мінулыя намеры.

Мяне пужае адзін з новых павеваў моды ў выхаванні — па скандынаўскай сістэме. Згодна ёй, дзіцяці павінна даваца поўная свабода ва ўсім, і ніякіх пакаранняў. Але гэта элементарнае няведанне дзіцячай псіхалогіі. Калі ў малога няма канкрэтна вызначаных бацькамі межаў, то ён адчувае сябе безабаронным. Ідэя такога выхавання хаваецца ў партнёрскіх адносінах: усе, маўляў, роўныя. У такой сітуацыі дзіця павінна само вырашаць усе складаныя сітуацыі, самастойна рабіць выбар, у якім яно можа не разбірацца, разумець, што для яго шкодна, а што карысна, прымаць на сябе ўсе наступствы ўласных рашэнняў. А гэта яму не па сілах. Праз гэта дзеці, якіх выхоўваюць надта дэмакратычна, найчасцей за ўсё вырастаюць неўротыкамі.

Але як можна зраўняць 6-гадовае дзяўчо, 40-гадовага мужчыну і 75-гадовую бабулю? Гэта немагчыма з пункту гледжання фізічнага стану, жыццёвага вопыту, сіл, здольнасцей, магчымасцей і перспектыў. Па скандынаўскай сістэме, калі тая ж бабуля не можа несці цяжкую торбу, яна павінна сама з гэтым справіцца. Бо дапамога ёй — гэта спроба паказаць, што яна мае патрэбу ў апецы, што яна ўжо не роўні. У славян жа спрадвечна існавала і цяпер жыве супрацьлеглая іерархічная сістэма: Бог, за ім вопытныя бабулі з дзядулямі, тата, матуля і потым дзеткі. Калі ты моцны мужчына — дапамажы малому ці бабулі. Бо ты ці падпарадкоўваешся ім, ці падпарадкоўваеш кагосьці. У абодвух выпадках нясеш пэўную адказнасць за абаіх, а ў яе ўваходзіць і стварэнне бяспечных умоў жыцця. Таму ў сістэме, уласцівай славянам, дзіця адчувае сябе найбольш абароненым і расце псіхалагічна здаровым.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Вазьму твой боль...

# Пакутаваць, каб цаніць




**З Цэнтрам дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі мяне звязваюць доўгія дзевяць гадоў валанцёрскай дзейнасці. Рознае было: і прыемна-пякучае, і адчайна-балючае. Але я вельмі ўдзячна лёсу, што гэта ёсць у маім жыцці. Я шчаслівая, што магу пераджыць чужы боль, задаволена, што прайшла кругі скрухі. Бо цяпер дакладна маю з чым параўноўваць і больш цаню ціхія моманты спакою.**

Пра элементарнае шчасце я ўпершыню пачула ад сваёй цёткі:

— Калі ў мяне моцна балела калена і я не магла хадзіць, глядзела на людзей і думала: якія яны шчаслівыя ад таго, што могуць хадзіць. А потым мне зрабілі аперацыю, меніск зажыў, я зноў хаджу і адчуваю сябе шчаслівай! Ты разумееш, што шчасце ў простым?!

Застаючыся нерухомай і пакутуючы ад невядомай будучыні, яна пераацаніла становішча здаровага чалавека. Аказваецца, можна быць шчаслівым толькі ад таго, што ты можаш самастойна рухацца. Мы не цэнім тага, пакуль маем. А ёй было з чым параўноўваць.

— Я такая шчаслівая, — казала падлетак Клава, калі я прыязджала да яе ў анкацэнтр. — Мне сёння знялі цэнтральны катэтар. Я насіла яго цэлы год. Няхай сабе гэта маленькая аперацыя, але з мяне нарэшце не тырчаць трубкі! І гэта ўжо нагода для шчасця!

Знудзіўшыся па сабе звычайнай, дзяўчына бачыць радасць у гэтай звычайнасці. Простыя, незаўважныя для нас рэчы для яе — цэлае свята.

— Я зламаў пазванок, але, на шчасце, спінны мозг не разарваўся, — прыгадвае сваё няпростыя прыгоды Пеця. — Пакуль ляжаў на бальнічным ложку, на месцы траўмы з'явіўся ацёк. Ад ціску рызыка разрыву спіннога мозга павялічвалася. Я цэлыя суткі баяўся паварушыцца, каб не застацца інвалідам. А калі прачнуўся пасля шасцігадзіннай аперацыі з трыма шурупамі ў пазваночніку, я адчуў сябе неверагодна шчаслівым. Я цяпер усё магу!

Яшчэ да траўмы ён не думаў, як шмат мае. А цяпер шчаслівы са скалечаным пазваночнікам, бо магло быць і горш.

Не спазнаўшы горыч кахання, сардэчныя пакуты, мы не ацэнім належным чынам новыя пачуцці. Ведаючы здраду, мы станем больш клапацііца, апякаць і ўкладаць у наступныя адносіны. Толькі спазнаўшы беднасць, мы ацэнім дастатак. А датыкнуўшыся да смерці, мы пачынаем цаніць жыццё. Бо ўсё пазнаецца ў параўнанні.

Гэта як у Мілана Кундэры пра «невыносную лёгкасць быцця»: лёгкасць насамрэч гэта не тое, да чаго мы імкнёмся і чаго нам хочацца. Толькі цяжкае мае вагу, толькі важкае мы цэнім. Лёгкасць не мае каштоўнасці, за ёй не стаіць вопыт, мудрасць, гісторыя.

Я ўдзячна сваім школьным часам, калі жылі з маці на яе невялікую зарплату. З сукенак яе маладосці я перашывала сабе сучасныя строі. Харчаваліся тым, што самі маглі вырасціць на агародзе. Мы нават набойкі на абутак ставілі металічныя. Яны страшэнна стукалі, я хадзіла, як падкаваны конь. Але гэта была добрая эканомія. З цеплынёй узгадваю тыя часы. Яны навучылі мяне стойкасці, аптымізму, загартавалі і далі магчымасць думаць пра нешта іншае, развівацца, шукаць сябе і шукаць дзверы ў новае жыццё.

Я сустракаю пестункоў, якія выраслі ў парніковых умовах, і спачуваю ім. У іх не атрымліваецца радавацца тым простым, малазаўважным момантам, якія для мяне маюць неверагоднае значэнне. Першы фен, набыты за свае ўласныя, упершыню зароблены грошы. Прыкус, папраўлены ў дваццаць гадоў, замест пачатковай школы. Маленькія адкрыцці, новыя магчымасці не цэняцца, калі няма з чым параўнаць. Мяне адначасова смешаць іх «беды»: зламаны пазногцік, няшчодры кавалер, адменены адпачынак, нясмачны абед у рэстаране. Праз сваю рафінаванасць яны няздольны справіцца з сапраўднымі перашкодамі і перанесці цяжкасці.

Я радуюся, калі на жыццёвым шляху сустракаю няпростага чалавека. І канфлікты, і недарэчнасці, і няўдачы прымаю з падзякай і годнасцю. Ведаю, што яны неабходны, каб расці, вучыцца, змяняцца. І цаніць. Больш цаніць процілеглaсці гэтых момантаў.

Памаліўшыся перад сном, я дзякую Богу за ўсё, што Ён паслаў мне ў гэты дзень. Раней прымушала сябе вымаўляць словы падзякі, асабліва пасля непрыемнага дня. А цяпер дзякую за такі яшчэ больш, чым за ўдалы. Бо ўсё пазнаецца ў параўнанні і менавіта няўдачы, цяжкасці і выратавальныя пакуты набліжаюць нас да шчасця.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

# ФІКУС, ШАФА, КРУГЛЫ СТОЛ...

## Адсюль пачынаўся Марк Шагал


Гаспадыня сустракае гасцей.

**Сказаць, што люблю музеі без памяці, я не магу. Я люблю музеі з памяццю. З той, праўда, яе катэгорыяй, якая прынцыпова не дае ніякай прасторы ні беспадстаўна развітай фантазіі, ні сімвалізму, прыцягнутаму без дай прычыны. Пратэстуючы супраць першага і другога, Марк Шагал, як памятаецца, неяк сцвярджаў: наш унутраны свет — цалкам рэальны. Можа быць, нават яшчэ болей рэальны, чым свет, што нас акаляе. Так ён і запісаў у кнізе «Маё жыццё».**

### Паслядоўнікам

*Наша наведванне дома-музея Шагала папярэднічала візіту ў блізкую ад Віцебска сядзібу Рэпіна «Здраўнёва». У выніку атрымалася ў літаральным сэнсе «жывапіснае» падарожжа, пасля якога захацелася чытаць белетрызаваныя біяграфіі мастакоў, іх асабістыя дзённікі і ліставанні. Так заўсёды: добрая вандроўка распальвае інтэлектуальны апетыт, задавальненне якога непазбежна вядзе да таго, што наступныя маршруты складваюцца самі сабой — як вынікі пасляпадарожных чытанняў і новых рамантычных настрояў. Прынамсі, пішучы гэтыя радкі, аўтарка іх ужо ведае, куды выпраўляцца далей.*


Дом-музей Марка Шагала ў Віцебску — былы бацькоўскі дом мастака.

Сям'я Сегалаў — Хацкеля Мардухавіча, Фейге-Ітэ Мендзелеўны і іх дзевяці дзяцей, з якіх Мойша, будучы «беларускі, рускі і французскі мастак яўрэйскага паходжання» (о, гэты лёс эмігрантаў!), быў старэйшым, — мела на пачатак XX стагоддзя на Вялікай Пакроўскай вуліцы ў Віцебску ажно чатыры збудаванні. Але ацалела з іх толькі адно, каменнае. Астатнія, драўляныя, згарэлі ў вайну. «Ворагу было мала горада на маіх карцінах, якія ён пакрамсаў як мог», — пісаў Марк Шагал у «Лісце да роднага Віцебска», выказваючы боль за абрабаваную і спаленую малую радзіму. Ён так і не наважыўся яе наведаць, калі быў у Савецкім Саюзе ў 1973-м: так баяўся ўбачыць у Віцебску і на сваёй Пакроўскай зусім не тое, што было там раней.

Меў рацыю.

Значыцца, Віцебск. Пакроўская вуліца, дом 11. Аднапавярховы, каменны. Гаспадыня, баявітая Фейге-Ітэ, жонка барадатага маўчуна Хацкеля, грузчыка рыбнай крамы (кажуць, яны адно адному былі стрыечнымі сястрою і братам), сустракае турыстаў у сваёй бакалейнай лаўцы, першым памяшканні ад уваходу. Ёй так да твару чорная сукенка з карункавым каўняром! А чорныя шнураваныя боцікі аднолькава падыходзяць да любога надвор'я... Зручна быць лялькай, што ні кажы. Побач з лялькай Фейге-Ітэ — вагі, бутэлькі, мяшэчкі, збанкі — усё тое, што традыцыйна стварае, так бы мовіць, адпаведны антураж, калі размова ідзе пра карчму або, як у нашым выпадку, лаўку.

Экспазіцыйная прастора ўсіх мемарыяльных пакояў непазбежна аднабаковая: яна абавязкова ўтрымлівае ў сваіх нетрах тое, што дзеля парадку названа прыгожа, але гучыць шаблонна, — элементы ўмоўнасці. У тым сэнсе, што ніколі нельга ведаць дакладна, што ў якім пакоі размяшчалася пры гаспадарах і як імі выкарыстоўвалася. Тым не менш у Доме-музеі Шагала ў Віцебску можна ўбачыць толькі самае сапраўднае — аб'ектыўную рэальнасць, дадзеную наведвальніку ў яго ўнутраных адчуваннях.

У доме-музеі Шагала няма, папярэджу, нічога з той хаты Сегалаў, якую мастак пакінуў, ажаніўшыся ў 1915-м з Бэлай Разенфельд. Бацькі апошняй былі, між іншым, не абы кім — валодалі ў Віцебску «сеткай» ювелірных «кропак». Але нам, як наведвальнікам, неяк не да таго: на нас уздзейнічае ці то абвешчанае самім майстрам «правіла ўнутранага свету», ці то талент аўтара «мастацкага рашэння» музея, ці ўсё разам — адначасова і адно другое ўзмацняючы.

З вывы на сцяне, а дакладней каментарыя пад ёю, даведваемся, што 7 мая 1902 года 15-гадовы Мойша Сегал пісаў пераклад пра вайну з Напалеонам. Глядзіш — і вока радуецца: гэты вучань другога класа Віцебскага гарадскога вучылішча выводзіў літары такім почыркам, якім перапісваліся хіба што манускрыпты ў скрыпторыях пры манастырах. Вось куды трэба вадзіць сучасных вучняў з іх каліграфічнымі «хваробамі». Нават такіх, як Марк Шагал, — таленавітых у далёка не першарадных прадметах.


Малюнак «Мая маці ля печкі з хлебам».

### Рамантыкам

*Ёсць такія мемарыяльныя музеі, трапіць у якія азначае нешта значна большае, чым даць радасць воку і інфармацыю вуху. Прысутнасць там задзейнічае аналізатары пахаў і дотыкаў. Наконт першага скажу, можа, і не вельмі арыгінальна: кожны па-сапраўднаму варты ўвагі музей мае свой пах, гэта адназначна. Наконт другога хочацца сцвярджаць у духу навуковага трактата: адсутнасць у наведвальніка музея, які з'яўляецца месцам чыёйсьці памяці, магчымасці дакранацца да экспанатаў стварае эфект адваротнага кшталту — экспанаты дакранаюцца да наведвальніка. Як так? Таямнічым, скажу я вам, чынам. Вы ніколі не адчувалі, як спускаецца на вашы плечы нешта мяккае і цёплае, як сплывае па руках бязважкасць і перадаецца ў ногі энергіяй вызвалення? Вы — вольныя: ад нязбыўных дагэтуль праблем і для самых крэатыўных дзеянняў. А вы меркавалі, што музеі існуюць для нечага іншага?..*

У 1911-м ён, сумуючы па роднай хаціне, намаляваў «Нашу залу» — з фікусам, шафай і круглым сталом. У прыцягальнасці гэтых прадметаў можа пераканацца ўбачаўшы: вось ён, фікус, побач са сталом і шафай, зялёны і бадзёры. З малюнкам пад назвай «Мая маці ля печкі з хлебам» — тая ж гісторыя: мэблю, посуд і асаблівa карункі на паліцах з парцалянавымі талеркамі Мойша адлюстраваў вельмі схематычна, літаральна ўмоўна. Але глядзіш на малюнкі, перанёсіш позірк на інтэр'ер і разумееш, што яно ёсць такое — той самы ўнутраны свет, пра які мастак пісаў як пра сапраўдную рэальнасць і праз які наведвальнікам музея прапануецца забыцца на тое, што гэта музей, і трапіць у госці да Хацкеля з Фейге-Ітэ. Здаецца, апошняя вось зараз высуне галаву аднекуль з-за занавескі і, выціраючы рукі пяродднікам, пачне заклапочана цікавіцца, ці прыстойнае гэта майстэрства — мастакоўскае. Страхі яе натуральныя: па-першае, цягне з сям'і ўсе грошы — на навучанне, пэндзлі і палатно, па-другое, да месца заняткаў у Юдэля Пэна сынок, небарака, дабіраецца пешкі, па-трэцяе, малюе там... Каб жа што добрае — дык не: то фіялетавых аслоў, то людзей, што лётаюць над горадам, быццам птушкі. Яна ўжо задавала гэтае пытанне некаму з пэнаўскіх вучняў, а той адказаў, што... Дзе там, маўляў, прыстойнае — ні прадаць, ні купіць, ні на што іншае выменяць. А мог жа стаць цырульнікам, як дзядзька Зуся, якому і ў гарадзе Парыжы не было б сорамна стрыгчы. Ну, або трымаць мясную лаўку з прыгожай апетытнай шыльдай у якім-небудзь не менш прыстойным месцы. Дзякаваць Богу і Пэну, што апошні па волі першага дазволіў таленавітаму пэцкальніку вучыцца бясплатна...

Як я заўсёды пішу, у любое падарожжа трэба ехаць падрыхтаванымі. Пераходзячы з пакоя ў пакой у родным доме Марка Шагала, найлепш за ўсё крыўдзіць у галаве радкі з яго кнігі «Маё жыццё». Успамінаць іх — і гадаць-меркаваць, у якім пакоі бацька шпульнуў сыну грошы, 27 няшчасных рублёў, якія той, поўзаючы і плачучы, падбіраў з падлогі пад сталом, прыгаворваючы, што вельмі-вельмі марыць вучыцца ў школе мастацтваў у Пецярбургу і што нічога яму не страшна. Бацька тады памаўчаў, потым распаліў самавар, наліў сабе гарбаты і з поўным ротам прабубнеў: «Хочаш — едзь, толькі на грошы больш не разлічвай».



Пад правай шыльдай на гэтай працы Шагала — цырульня дзядзькі Зусі.

Самавар у гэтым доме ёсць. І вось жа ведаеш, што не той, а верыш: гэта з яго наліў сабе гарбаты Хацкель...

Падарожнічала
Святлана ДЗЯНІСАВА.


У кухні, на Пакроўскай, 11.

■ Што бывае

### ПРА СЭНСЫ

*Некаторыя трошкі больш знакамітыя, чым аўтарка гэтых радкоў, падарожнікі самі не рызыкуюць вандраваць з начоўкамі і іншым не раяць. Беларусь, маўляў, такая маленькая... Літаральна 650 на 560, калі ў кіламетрах. Ранкам выехаўшы, да заходу сонца шмат што можна ўбачыць і паспець вярнуцца дамоў, каб заснуць ва ўтульным ложку. Мне іх трошкі шкада. Таму што ў начах пад зорным небам тоіцца вялікі сэнс разумення сябе ў Сусвеце. Прабуджэнне ад дотыку сонца мае значны ўплыў на свядомасць і светапогляд. Працяглая адсутнасць дома праз немагчымасць неадкладнай рэалізацыі тых ці іншых намераў нарадждае безліч нечаваных ідэй, якія і па вяртанні пад родны дах з галавы не выветрываюцца. А ўвогуле, хто сказаў, што неба Беларусі — не родны дах?*

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА



Ганненскі кірмаш праводзіцца ў Зэльве, можна лічыць, з 1501 года. Ганненскім названы ў гонар Ганны Улініч, удавы гаспадара мястэчка Міхаіла Начовіча. З 1720-га яго правядзенне было «ўзаконена» адным з Сапегаў, які ўстанавіў дакладны тэрмін — з 25 ліпеня па 25 жніўня. З тым Сапегам і сёння ніхто не спрачаецца: Ганненскі кірмаш у 2015-м пройдзе 22 і 23 жніўня. Два дні замест чатырох тыдняў — не бяда, калі размова ідзе пра кірмаш, які быў у ранейшай Еўропе другім пасля Лейпцыгскага.

**Не трасе яблыкі, пакуль зялёныя, паспеюць — самі зваляцца. 22 жніўня ў Шаркаўшчыне — Яблычны Спас. Пачатак а 11-й раніцы. Першай справай асвецяць новы ўраджай, потым запросяць у музей садоўніка Івана Сікоры. Акрамя таго, гасцей свята чакаюць «Яблычнае вяселле», «Яблычны кірмаш», «Яблычная пляцоўка»... Бо яблыкі паспелі!**

У Нацыянальным гістарычным — вялікая прэзентацыя рэліквій Беларусі і свету: дзвюх тысяч прадметаў, аб'яднаных у 20 калекцый. Карта Мінскай губерні 1800 года, грошы часу паўстання Касцюшкі, патэнт з першай паловы XIX стагоддзя на пацвярджэнне шляхецкай годнасці... Манеты, гадзіннікі, мэбля, карціны... Абразы, старадрукі, слуцкія паясы... Назва выставы: «79 прыступак у глыб гісторыі». Варта іх пералічыць асабіста.

**29 жніўня ў Гальшанскім замку — свята старых мелодый, рыцарскіх перамог і ўсялякіх спрадвечных рамёстваў. Заначуеце каля сцен — не забудзьцеся зірнуць на месячык. Ці ўбачыце на ім загадкавую Панну?**



У Капенгагене да 30 жніўня — смачны фэст, самы значны ў Даніі. Калі трапіце на яго, то паспытаеце яблычны пірог з парэчкавым жэле, паласуецеся супам з ажынай, ацэніце на смак печань з хрумсткай цыбуляй і знакаміты шмёрабрад. Не пытайцеся, з чаго ён гатуецца. Лепш адзін раз пакаштаваць, чым сто разоў прачытаць рэцэпт. Ці не так?

**Віннны рынак у Майнцы, што ў Германіі, працуе з 27 жніўня да 6 верасня, але не кожны дзень, а толькі два, як там кажуць, уік-энды: з пятніц па нядзелі ўключна. І самае цікавае там у гэтыя дні — не дэгустацыі вінаў, а іх музычныя суправаджэнні.**

Свята беларускага пісьменства выпала сёлета на 6 верасня. Канцэнтрацыя пісьменнікаў у гэты дзень будзе рэзка павышана ў Шчучыне, дзе збіраецца адкрыцца аднаўлены палац Друцкіх-Любецкіх. Хочаце убачыць палац і пазнаёміцца з жывымі ўладальнікамі прозвішчаў з кніжных вокладак? Заменжныя аўтары бестселераў таксама чакаюцца.

# КАМЕНЬ-ДЭЗАДАРАНТ

## І арэхі замест мыла

**А ці ведаеце вы, з чаго зроблены ваш шампунь ці гель для душа? Я, напрыклад, губляюся ў грувастких назвах хімічных спалучэнняў і не заўжды разумею, ці бяспечныя яны для майго здароўя. Рызыкнуць адмовіцца ад прывычных сродкаў гігіены пакуль цяжка, хаця мне ёсць з каго браць прыклад. Маладая сям'я — Дзмітрый і Юлія ПЯСЕЦКІЯ — якраз з тых людзей, якія ўмеюць чытаць складаную «мову» этыкетак. Не так даўно прыхільнікі здаровага ладу жыцця адкрылі ўласную краму натуральнай касметыкі. Спецыяльна для «Сямейнай газеты» яны распавялі і паказалі, як дарамі прыроды можна замяніць традыцыйныя сродкі гігіены.**

### ДАВЕДАЕШСЯ ПА ВОДАРЫ

— У студэнцкія гады мы з дзяўчатамі арандавалі кватэру, і, калі адна з нас знаходзіла нешта цікавае, заўжды дзялілася з іншымі, — распавядае пра пераход да прыроднай касметыкі Юля. — Аднойчы мая суседка прызналася, што мые бялізну мыльнымі арэхамі, а валасы — парашком мыльных бабоў шыкакаі (стручок акацыі). Я таксама вырашыла паспрабаваць. Паўгода мыла галаву жытняй мукой, мыльнымі арэхамі, гарчыцай, шыкакаі. А пасля сама пачала варыць шампуні для сябе і мужа.

Дзяўчына ўпэўнена: хімічныя сродкі гігіены заўжды можна замяніць натуральнымі. Звычайнай содай мыюць галаву, робяць з яе скраб. Мыла замяняюць аўсянкай альбо аўсяным талакном з травамі. Менавіта з гэтай крупы атрымліваюць аюрведычны сродак для ачышчэння скуры — убтан. Гатуецца ён проста: аўсянку трэба перамалоць з травамі, дабавіць парашок амлы (індыйскі агрэст), шыкакаі і змяльчыць сумесь у кавамолцы.

Дзіма таксама заўжды імкнуўся карыстацца натуральнымі сродкамі гігіены. Па яго словах, сёння многія прадаўцы спекулююць на словах «экалагічны» і «натуральны».

— Юрыдычнага паняцця «натуральная касметыка» не існуе, — заўважае хлопец. — Можна знайсці шампуні, у якіх толькі 95% кампанентаў будуць натуральнымі, а што ў астачы — невядома. Сапраўднай прыроднай касметыкі вельмі мала, гэта вузкі рынак. Напрыклад, чалавек варыў мыла, а пасля зрабіў з гэтага бізнес.

Як распазнаць — дзе натуральнае, а дзе штучнае? Дзіма кажа, што, калі нюхаеш сапраўдную натуральную касметыку, атрымліваеш асалоду ад незвычайнага пяшчотнага водару. Прадукты з «хіміяй» маюць ярка выражаны ненатуральны пах.

— Для сябе і нашых пакупнікоў мы выбіраем толькі тыя тавары, склад якіх зразумелы звычайнаму чалавеку, — адзначае Юлія. — Натуральныя касметычныя сродкі месцяць у сабе алеі, травяныя парашкі, гліны.



Натуральны шампунь лёгка гатуецца з арэхаў трыфаліятус.



Сям'я Пясецкіх раіць рабіць сродкі гігіены сваімі рукамі.

### ЦІ ДОЎГА ЖЫВЕ НАТУРАЛЬНЫ ШАМПУНЬ?

Трыфаліятус і мукаросі — два віды індыйскіх мыльных арэхаў. Мукаросі выкарыстоўваецца для ручнога і машыннага мыцця бялізны. Калі паспрабуеце памыць ім галаву, заўважыце, што валасы стануць жорсткімі. Трыфаліятус, наадварот, больш падыходзіць для цела і валасоў, праць ім не рэкамендуецца: арэхі даюць карычневае адценне і могуць пафарбаваць ваша адзенне.

— Калі ў мяне мала часу, я хапаю шэсць арэшкаў і заліваю іх гарачай вадой, — распавядае Юлія. — Пасля таго як яны астылі і разбухлі, адціскаем і мыем атрыманай вадкасцю галаву. Потым «адвар» трэба змыць. Калі час дазваляе, то ў гэты раствор я дабаўляю парашок шыкакаі альбо амлу. Маску можна патрымаць на галаве хвілін 15-20, пасля змыць вадой. Трэці варыянт — зварыць шампунь. Бяром 100 грамаў арэшкаў, дабаўляем у ваду (паўтара літра), закідваем розныя травы: крапіву, рамонак, корань аеру, календулу — і варым. Калі раствор астыне, яго трэба працадзіць. У гэты «кампот» можна дабавіць 3-4 сталовыя лыжкі жытняй мукі. Перамешваем і праціраем праз сіта, ставім на газ. Для гушчыні дабаўце больш мукі. Пераліваем у слоік і ставім у халадзільнік. Шампунь атрымае прыемны водар і захаваецца даўжэй, калі ўліць у яго эфірнае лавандавае масла. «Жывое» такі сродак 2-3 тыдні.

Выбіраючы мыла, шукайце зваранае на аснове алеяў. Калі жадаеце ўвогуле абысціся без яго — скарыстайцеся трыфаліятусам. Пакладзіце арэхі ў ільняны мяшочак: мяккай мачалкі хапае на 3-4 разы, пасля варта замяніць арэхі. Захоўвайце яе ў маразілцы альбо пасля выкарыстання кладзіце на батарэю — у сухім выглядзе мачалка праслужыць вам даўжэй.



Квасцовы камень алуніт — альтэрнатыва дэзадаранту.

### РЭЦЭПТ МАСКІ ДЛЯ ВАЛАСОЎ

У алей амлы дабаўляем звычайную хну без колеру і лыжачку звычайнай гліны. Дробка карыцы прастымулюе рост валасоў і надасць ім прыемны пах. Калі ў вас сухія валасы, не перашкодзіць лыжачка какосавага алею. Калі валасы тлустыя, гэта неабавязкова. Дабаўляем сумесь траў — крапівы, календулы, рамонку. Маску заліваем кіпнем і трымаем 10 хвілін: за гэты час амла ўбярэ ў сябе водар траў. Валасы папярэдне змочваем вадой і раўнамерна размяркоўваем атрыманую сумесь па галаве, апранаем шапачку і пакідаем на гадзіну. Пасля змываем маску вадой.



Юлія ўпэўнена: пакупную касметыку заўжды можна замяніць прыроднай.

### КОРАНЬ-ШЧОТКА І КРЫШТАЛІК СВЕЖАСЦІ

Юля і Дзіма чысцяць зубы травяным парашком ад сібірскай траўніцы. У адрозненне ад звычайнай пасты ён амаль не пеніцца, затое выдатна лечыць дзёсны. На Усходзе здаўна карыстаюцца місваком — гэта корань дрэва сальвадора персідская (ён месціць у сабе рэчыва, якое пазбаўляе зубы ад налёту і зубнога камню). З «палачкі» неабходна зняць кару і зрабіць з яе шчотку.

— Мне няручна карыстацца такім сродкам, бо ён дрэнна пранікае між зубоў, — прызнаецца Юля. — Таму я аддаю перавагу молатаму місваку, часам змешваю яго з зубным парашком.

Дэзадарант можна замяніць алунітам, альбо квасцовым каменем. Кавалачак «крыстала свежасці» выглядае як дробка солі. І на смак ён церпкі, салёны, горкі і кіслы адначасова. Пры захворванні алунітам можна паласкаць горла. Але як з каменя атрымаць дэзадарант?

— Змочваеш крыстал пад вадой, наносіш на чыстую скуру ў патрэбных месцах. Пацець будзеш, але паху не застанецца, — тлумачыць тэхналогію Юля. — Плюс алуніту яшчэ і ў тым, што сам па сабе ён не пахне, а значыць, не будзе змешвацца з водарам духоў. Апошнія тры гады карыстаюся толькі такім дэзадарантам. Звычайныя сродкі закаркоўваюць поры, таксіны застаюцца ў целе, што можа прывесці да сур'ёзных захворванняў, у тым ліку да раку грудзей.

Калі жадаеце атрымаць вадкі дэзадарант, вазьміце палову чайнай лыжкі алуніту, развядзіце з вадой, дабаўце кроплю эфірнага масла альбо гідралату (кветкавую ваду). Потым пераліце гатовы сродак у слоік-спрэй.

Як бачыце, для таго каб зрабіць натуральныя сродкі гігіены, не патрабуецца вялікіх высілкаў і грошай. Часам мы гатовы заплаціць больш за маркіроўку «экалагічны», асабліва не разбіраючыся ў бясшкоднасці кампанентаў сродку. Знайсці экзатычныя тавары можна ў спецыяльных інтэрнэт-крамах, тыя ж мыльныя арэхі ёсць і ў індыйскіх крамах. Прыродная касметыка будзе каштаваць вам амаль столькі, колькі і хімічная. Аднак лепш пачніце з малога: паспрабуйце ўмывацца аўсянкай, якая заўжды ёсць пад рукой. Ці зрабіце мачалку з арэшкаў і паназірайце за сваімі адчуваннямі: яны вас дакладна не падмануць!

### ПАРАДЫ ЭКОЛАГАЎ УСТАНОВЫ «ЦЭНТР ЭКАЛАГІЧНЫХ РАШЭННЯЎ»

Абавязкова правярайце крэм на наяўнасць ў ім мінеральнага масла, аддушак (пазначаюцца як Perfum ці Fragrance), парабенаў — гэтыя інгрэдыенты могуць правакаваць запаленчыя працэсы ў слаях скуры, што прыводзіць да з'яўлення маршчын і зніжэння тонусу скуры.

Мінеральнае масла часта дабаўляецца ў касметыку і хаваецца пад рознымі назвамі: вадкі парафін (liquidparaffin), парафінавае масла (paraffinoil, paraffinumliquidium), вадкі вазелін (petrolatumliquid, petroleumoil), белае мінеральнае масла (whitemineraloil), белае масла. Яно ўтварае на скуры плёнку, якая не дыхае. Гэта ў далейшым можа прывесці да абязводжвання, пачырванення, зніжэння бар'ерных функцый і павышэння адчувальнасці скуры.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 25 сентября 2015 г. АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

### Организатор аукциона – Комиссия по организации и проведению аукционов Шумилинского районного исполнительного комитета

| Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель | Площадь земельного участка, га | Срок аренды, лет | Назначение участка | Начальная цена объекта, руб. | Сумма задатка, руб. | Сумма расходов по организации аукционов |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Шумилинский р-н, аг. Светлосельский, ул. Молодежная, 30, кадастровый №225882006601000156 Арендодатель – Шумилинский районный исполнительный комитет | 0,0049 | 50 | для размещения торгового киоска (земельный участок для размещения объектов розничной торговли код 1 16 03) | 772 500 | 100 000 | 16 537 415 |

1. Аукцион состоится **25 сентября 2015 года в 14.00** по адресу: г.п. Шумилино, ул. Короткина, 10, 2-й этаж, кабинет 226.

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **до 22 сентября 2015 года включительно** в рабочие дни с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.00 по адресу: г.п. Шумилино, ул. Короткина, 10, кабинет 224. Заключительная регистрация участников проводится **25 сентября 2015 г. с 12.00 до 13.00.**

4. К заявлению об участии в аукционе прилагается заверенная копия платежного поручения о внесении задатка и представляются следующие документы:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителю гражданина – доверенность, удостоверенная нотариально; юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации; представителями индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

5. *Сумма задатка перечисляется: на счет Светлосельского сельисполкома № 3600331075013 в ЦБУ №225 г.п. Шумилино филиала №200 Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», ОКПО 28680019, УНП 300594330, код платежа 04902.*

6. Победителем аукциона будет признан участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию земельного участка, государственной регистрации земельного участка и расходы, связанные с опубликованием объявления; внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Контактные телефоны в г.п. Шумилино: 8(02130) 41243, 41631, 41505.

## ДУНИЛОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ И НОВОСЁЛКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### проводит аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

| Дата, время, место проведения аукциона | 25 сентября 2015 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25) | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена | № лот | Адреса участков | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, руб. | Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение |
| | 1 | Витебская обл., Поставский р-н, аг. Дуниловичи, ул. Я. Купалы, 4А | 0,1126 | 224081702101000287 | водоохранная зона водного объекта оз. Бледное | 30 000 000 | 13 881 200 |
| | 2 | Витебская обл., Поставский р-н, д. Гавриловичи, ул. Приозерная, 34 | 0,0800 | 224084003601000075 | водоохранная зона водного объекта оз. Лучайское | 30 000 000 | 14 337 100 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона | - в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с их изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения, формирования земельных участков, в т.ч. государственной регистрации;<br>- в течение двух месяцев после утверждения протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок;<br>- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>- приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в течение года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него | | | | | | |
| Порядок осмотра на местности земельного участка | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 | | | | | | |
| Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32, общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность | | | | | | |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 22.09.2015 включительно | | | | | | |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения | 10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет соответствующего сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе | | | | | | |
| Адрес и номер контактного телефона комиссии | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны: 8 (02155) 43180, 41132 | | | | | | |

## СЛОБОДСКОЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### 24 сентября 2015 года по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Слобода, ул. Школьная, 5, зал заседаний (2-й этаж) в 11.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Слободской с/Совет | д. Казённые Борки, ул. Центральная, уч. 7 | 0,1500 | 625683204901000015 | 10 000 000 | 9 531 500 |
| Лот № 2 | Слободской с/Совет | д. Казённые Борки, ул. Центральная, уч. 11 | 0,2500 | 625683204901000017 | 20 000 000 | 8 836 100 |
| Лот № 3 | Слободской с/Совет | д. Казённые Борки, ул. Центральная, уч. 11А | 0,2500 | 625683204901000018 | 20 000 000 | 8 836 100 |
| Лот № 4 | Слободской с/Совет | д. Казённые Борки, ул. Центральная, уч. 21 | 0,2500 | 625683204901000016 | 20 000 000 | 8 836 100 |
| Лот № 5 | Слободской с/Совет | д. Госьбищи, ул. Радужная, уч. 18 | 0,2500 | 625683202801000055 | 150 000 000 | 10 245 200 |
| Лот № 6 | Слободской с/Совет | д. Госьбищи, ул. Радужная, уч. 20 | 0,2500 | 625683202801000054 | 150 000 000 | 9 783 100 |
| Лот № 7 | Слободской с/Совет | д. Госьбищи, ул. Радужная, уч. 22 | 0,2500 | 625683202801000053 | 150 000 000 | 8 836 100 |
| Лот № 8 | Слободской с/Совет | д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 4А | 0,1500 | 62568303501000098 | 15 500 000 | 6 662 300 |
| Лот № 9 | Слободской с/Совет | д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 6А | 0,1500 | 625683203501000097 | 15 500 000 | 9 149 000 |
| Лот № 10 | Слободской с/Совет | д. Хоромицкие, ул. Центральная, уч. 57 | 0,1500 | 625683208701000073 | 11 000 000 | 9 639 500 |
| Лот № 11 | Слободской с/Совет | д. Хоромицкие, ул. Центральная, уч. 57А | 0,1500 | 625683208701000074 | 11 000 000 | 9 639 500 |
| Лот № 12 | Слободской с/Совет | д. Кривели, ул. Набережная, уч. 1А | 0,2100 | 625683205601000091 | 100 000 000 | 8 709 700 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению.

Участок в д. Кривели находится в живописном месте рядом с Лошанским водохранилищем, имеется возможность подключения к электроснабжению и водоснабжению.

Участки в д. Казённые Борки и д. Госьбищи находятся возле лесного массива.

Участки в д. Долгиново находятся вблизи леса. В деревне имеется магазин.

Участки в д. Хоромицкие находятся вблизи озера и лесного массива.

*Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3641062500156 Слободской сельский исполнительный комитет в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 601073740, код платежа – 04901.*

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Слобода, ул. Школьная, 5, кабинет управляющего делами, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **по 17 сентября 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by либо по телефонам (801718) 32215, 32414, 32263.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 440/С-11644 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – рынок), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Первомайская, рынок. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие (площадью 3678 кв.м), крытые столы (2 шт.), туалет блочный, калитка металлическая (4 шт.), ворота металлические (2 шт.), забор ж/б (длина 239,89 м) |
| Земельный участок | Кадастровый номер 424950100001002619, площадью 0,3932 га (назначение – размещение коммерческих, оздоровительных, культурных, торговых, бытовых объектов), по адресу: г. Ошмяны, ул. Первомайская, б/н. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта, код – 1,1, площадью – 0,3932 |
| Начальная цена продажи | 675 921 600 (шестьсот семьдесят пять миллионов девятьсот двадцать одна тысяча шестьсот) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 33 796 080 (тридцать три миллиона семьсот девяносто шесть тысяч восемьдесят) белорусских рублей |
| Продавец | Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, 8-01593-4-44-84 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| Условия аукциона | Сохранение рынка и проведение его реконструкции |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 07 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, и заверенные копии учредительных документов;
- *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первых торгов было размещено в газете «Звязда» от 13.06.2014 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений 01 сентября 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», дополнительная информация: www.ino.by**

31 августа 2015 г. в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1. О переизбрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Сантехэлектромонтаж».

2. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Местонахождение ОАО «Сантехэлектромонтаж»: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 21.08.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400052115

■ 50+: Жыць цікава

# «ХУТЧЭЙ БЫ НА ТАНЦЫ!»

## У далёкім 1975-м Аляксандр аказаўся адзіным хлопцам на вяселлі сябра, які ўмеў вальсаваць

**Аляксандр Андрэевіч і Галіна Рыгораўна ЗАХАРЭНКІ сустрэлі мяне на ганку цэнтра сацабслугоўвання — абодва стройныя, маладжавыя, падцягнутыя. 40 гадоў таму яны ппазнаёміліся дзякуючы танцу і працягваюць танчыць да гэтага часу! І, мяркуючы па ўсім, па-ранейшаму закаханы адно ў аднаго.**



### «ПАХУДЗЕЛА ЗА ГОД НА 10 КІЛАГРАМАЎ БЕЗ УСЯЛЯКІХ ДЫЕТ»

— Мы вельмі любім танцаваць, — кажа Галіна Захарэнка. — Але, калі працавалі, не было часу, каб пайсці на курсы. Наша спартыўная сям'я; муж — майстар спорту па парашутным спорце, займаўся і боксам, і падводным паляваннем. А танцы былі проста мілым хобі, танчылі ў гасцях...

І вось тры гады таму я выпадкова прачытала пра тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна Мінска і прыйшла туды «на разведку». Вахцёр на ўваходзе пытаецца: «Што вы хочаце?». А мне было цікава даведацца пра гурткі. Спытала, ці ёсць танцы. «Так, ёсць, ідзіце ў актавую залу, там якраз выкладчыца», — адказаў вахцёр. Так мы сталі хадзіць сюды танцаваць.

«Танец — гэта прыгажосць, рух, вытанчанасць і здароўе», — лічыць Аляксандр Захарэнка. «Пастава становіцца прыгожай! Мышцы ўмацоўваюцца! Паляпшаецца каардынацыя рухаў! Зараз, калі прапускаем занятак, вельмі перажываем. Цягне займацца! Гаворым сабе: хутчэй бы на танцы!» — смяецца яго жонка. Яна не хавае, што з-за ўзросту не заўсёды бывае лёгка: то спіна баліць, то сэрца цягне. Трэба проста прыслухоўвацца да свайго арганізма, але не занадта патураць — і тады ўсё будзе добра.

Галіна Рыгораўна прызнаецца, што, займаючыся танцамі, пахудзела за год на 10 кілаграмаў. І без усялякіх дыет! «Таму што нагрузка, — лічыць яна. — Часам, развучваючы рухі, уся мокрая была. Затое адчуваю сябе добра».

Каб навучыцца правільным рухам, трэба папрацаваць, адразу не атрымліваецца. Некаторых гэта адпуджвае. Але вельмі важна не адступаць пры першых складанасцях: чым больш займаешся, тым лягчэй у рэшце рэшт становіцца.

— У Мінску шмат месцаў, дзе можна навучыцца танчыць, — кажа Аляксандр Андрэевіч. — Але гэта дорага! За месяц заняткаў трэба аддаць 400 тысяч, для пары — ужо 750 тысяч. Не кожны чалавек, а тым больш пенсіянер, можа дазволіць сабе выкладваць такія сумы. А тут, у нашым цэнтры, усё гэта бясплатна.

**«Танцы трэба абавязкова выкладаць у школе, нават у дзіцячым садку ўжо можна пачынаць. Людзі павінны ўмець танцаваць!»**

З вялікай цеплынёй сужэнцы кажуць аб сваёй выкладчыцы Валянціне Пятроўне Новікавай, якая ў мінулым была зоркай бальных танцаў. На жаль, у сакавіку гэтага года яна пайшла з жыцця. «Цяпер у нас пастаяннага трэнера няма, таму што мы пенсіянеры і прыходзім сюды днём. Таму ў асноўным займаемся самастойна. Глядзім розныя рухі, танцавальныя звязкі ў інтэрнэце, а потым развучваем самі. Так вывучылі павольны фокстрот, ча-ча-ча», — кажуць муж і жонка.

### «КАБ, ПАГЛЯДЗЕЎШЫ НА НАС, І ІНШЫЯ СТАЛІ ЗАЙМАЦЦА...»

Дарэчы, Аляксандр і Галіна Захарэнкі цяпер ужо не проста танчаць для сябе, а радуюць сваім мастацтвам гледачоў. Выступаць сталі не так даўно, што, улічваючы іх не вельмі юны ўзрост (Аляксандру 68 гадоў, Галіне — 63), ужо само па сабе захапляе.

— Кожны кастрычнік у Мінску праходзіць выстава «50+» у Палацы мастацтваў. Мы там звычайна выступаем. Гледачам вельмі падабаецца, цёпла нас прымаюць, — распавядае жонка. — У Акадэмію навук нас запрашалі, у 113-ю гімназію на выпускны баль... Там мы наладзілі своеасаблівы танцавальны дыялог пакаленняў: маладыя танцавалі свае танцы, а мы — класіку.

— Мы самі праяўляем ініцыятыву. Адпачывалі ў санаторыі ад нашага «Белтэлекама» (дзе калісьці працавалі) і станчылі там. Так усе даведаліся, што мы займаемся танцамі, і потым прафкам прадпрыемства стаў запрашаць нас выступіць на рэспубліканскім конкурсе. Калі ў гэтым годзе запрасіць, мы паедзем з танга — ужо рэпеціруем! Наш тэлефон запісалі і ў Палацы прафсаюзаў. Увосень там праходзіць штогадовы баль. Запросяць — станчым і там, не запросяць — нічога страшнага, мы ж гэта робім, па вялікім рахунку, для сябе, свайго задавальнення. А выступленні — гэта ў пэўным сэнсе прапаганда. Каб, паглядзеўшы на нас, сталі займацца і іншыя людзі.

— Сёлета пайшлі на вечар, дзе людзі танцуюць танга, — кажа Галіна. — І я заўважыла, якія разняволеныя людзі там збіраюцца. Гэта вельмі добра! Бо раней як было? Я не ўмею танчыць — і не буду, пастаю ўбаку. А цяпер — не ўмееш, але спрабуюць. Я наогул лічу, што танцы трэба абавязкова выкладаць у школе, нават у дзіцячым садку ўжо можна пачынаць. Людзі павінны ўмець танцаваць!

### СЕТЦЫ ЎСЕ ЎЗРОСТЫ ПАКОРЛІВЫЯ

Наогул, у цэнтры сацабслугоўвання ўся праца, найперш выкладанне ў гуртках і на курсах, заснавана ў асноўным на валанцёрстве. Гэта значыць, людзі тут у большасці сваёй працуюць бясплатна. Вось і Аляксандр Захарэнка таксама — не толькі танчыць, але і працуе ў якасці валанцёра: вядзе камп'ютарныя курсы, на якіх у рамках праекта «Сетцы ўсе ўзросты пакорлівыя» вучыць іншых пенсіянераў працаваць з камп'ютарам.

Ён сам, перш чым выйсці на заслужаны адпачынак, працаваў у Мінскім вытворчым аб'яднанні вылічальнай тэхнікі, потым на «Інтэграле», у Мінскай гарадской тэлефоннай сетцы. Увогуле, можна сказаць: усё яго жыццё была звязана з камп'ютарамі. І калі зараз сутыкнуўся з тым, што цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва мае патрэбу ў выкладчыках камп'ютарнай асветы, пагадзіўся папрацаваць.

— Жонку вучыць не давялося, яна сама доўгі час працавала матэматыкам-праграмістам, — усміхаецца ён. — Але ўвогуле старэйшае пакаленне за рэдкім выключэннем не валодае камп'ютарам. Між тым уменне працаваць з ім вельмі дапамагае ў жыцці. Цяпер сваякі і дзеці часцяком з'язджаюць на край свету. А калі валодаеш камп'ютарам, можаш без праблем мець зносіны з імі па Skype, прычым цалкам бясплатна. Можна таксама пагутарыць са сваімі сябрамі маладосці ў «Одноклассниках», талончык да ўрача замовіць праз інтэрнэт, квіткі, нешта купіць... Пажылым людзям гэта вельмі зручна, бо пры гэтым нават з дому не трэба выходзіць! І галава працуе: мозг не «ўсыхае»...

Дні ў Аляксандра і Галіны Захарэнкаў, бывае, распісаны ледзь не па хвілінах: столькі ўсяго трэба паспець. Бо і дзеці ёсць, і ўнукі — усім дапамагчы хочацца. Але, мяркуючы па ўсім, такое актыўнае жыццё ім падабаецца!

**Святлана БУСЬКО,**
*busko@zviazda.by*

**Фота з архіва сям'і Захарэнкаў**

■

■ Урок мудрасці

# «Я НІКОЛІ НЕ БЫЎ АНЁЛАМ»

## Вытрымкі з ліста Чарлі Чапліна сваёй дачцэ

**Чарлі Чаплін, бацька 12 дзяцей, калі яму было 76 гадоў, напісаў кранальнае пасланне сваёй дваццацігадовай дачцэ Джэральдзіне, якая шукала сябе ў танцы на парыжскай сцэне. Ліст вельмі эмацыйны, глыбока асабісты, але ў той жа час ён падыходзіць кожнаму з нас. Гэта ўзор бацькавай любові і клопату, суму і радасці, гонару і перажыванняў, назапашанай мудрасці і дзяцінства, якое захавалася ў ім. «Я ніколі не быў анёлам, — пісаў геній кінематографа, — але я заўсёды імкнуўся быць чалавекам. Пастарайся і ты». Прачытайце і падумайце, чаму навучылі вас вашы бацькі і чаму вы хацелі б навучыць вашых дзяцей.**

«Дзяўчынка мая! Будзь прыгажуняй і танчы! Будзь зоркай і ззяй! Але калі захапленні і падзяка публікі цябе ап'яняць, калі водар падораных кветак закружыць табе галаву, то сядзь у куточак і прачытай мой ліст, прыслухайся да голасу свайго сэрца.

Ці ведаеш ты, колькі начэй я праседжваў ля твайго ложачка, калі ты была зусім малечай, распавядаючы табе казкі пра спячую прыгажуню, пра нядрэмлючага цмока? А калі сон цямніў мае старэчыя вочы, я кпіў з яго і казаў: «Прэч! Мой сон — гэта мары маёй дачкі!»

Я бачыў твае мары, Джэральдзіна, бачыў тваю будучыню, твой сённяшні дзень. Я бачыў дзяўчыну, якая танцуе на сцэне, фею, якая слізгае па небе. Чуў, як публіцы казалі: «Бачыце гэтую дзяўчыну? Яна дачка старога блазна. Памятаеце, яго клікалі Чарлі?» Так, я — Чарлі! Я — стары блазан! Сёння твая чарга. Танцуй! Я танцаваў у шырокіх драных штанах, а ты танцуеш у шаўковым строі прынцэсы.

Гэтыя танцы і гром апладысментаў часам будуць узносіць цябе на нябёсы. Ляці! Ляці туды! Але спускайся і на зямлю! Ты павінна бачыць жыццё людзей, жыццё тых вулічных танцоўшчыкаў, якія танчаць, дрыжучы ад холаду і голаду. Я быў такім, як яны, Джэральдзіна.

Я спяваў і танчыў у бедных кварталах Лондана, а потым збіраў міласціну. Я спазнаў, што такое голад, што такое не мець даху над галавой. Больш за тое, я адчуў прыніжальны боль вандроўца-блазна, у грудзях якога бушаваў цэлы акіян гонару, і гэты гонар балюча ранілі кідаемыя манеты.

Я памру, але ты будзеш жыць. Я хачу, каб ты ніколі не ведала беднасці. З гэтым лістом дасылаю табе чэкавую кніжку, каб ты магла траціць, колькі захочаш. Але калі патраціш два франкі, не забудзься нагадаць сабе, што трэцяя манета — не твая. Яна павінна належаць незнаёмаму чалавеку, які ў ёй мае патрэбу. А такога ты лёгка зможаш знайсці. Варта толькі захацець убачыць гэтых незнаёмых беднякоў, і ты сустрэнеш іх паўсюль. Я кажу табе пра грошы, бо спазнаў іх д'ябальскую сілу. Я нямала правёў часу ў цырку. І заўсёды вельмі хваляваўся за канатаходца. Але павінен сказаць табе, што людзі часцей падаюць на цвёрдай зямлі, чым канатаходцы з ненадзейнага каната.

Можа быць, у адзін цудоўны дзень цябе возьме ў палон прыгожы твар якога-небудзь прынца. У гэты ж дзень ты станеш неспрактыкаваным канатаходцам, а нявопытныя падаюць заўсёды. Не прадавай свайго сэрца за золата і каштоўнасці. Ведай, што самы велізарны брыльянт — гэта сонца. На шчасце, яно зіхаціць для ўсіх. А калі прыйдзе час і ты палюбіш, то любі гэтага чалавека ўсім сэрцам.



Праца ў цябе цяжкая, я гэта ведаю. Тваё цела прыкрыта толькі кавалкам шоўку. Дзеля мастацтва можна з'явіцца на сцэне і аголеным, але вярнуцца адтуль трэба не толькі апранутым, але і больш чыстым. Я ўжо стары, і, можа быць, мае словы гучаць смешна. Але, па-мойму, тваё аголенае цела павінна належаць таму, хто пакахае тваю аголеную душу.

Нават тады, калі кроў у маіх жылах астыне, я хачу, каб ты не забылася пра свайго бацьку Чарлі. Я не быў анёлам, але заўсёды імкнуўся быць чалавекам. Пастарайся і ты. Цалую цябе, Джэральдзіна. Твой Чарлі. Снежань 1965 г.»

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ТРЫ ТАВАРЫШЫ... ПА НЯШЧАСЦІ

**Лічу абавязкам распавесці пра свайго бацьку — КАЛІНКОВІЧА Мікалая Іванавіча, аднаго з першых партызанскіх камандзіраў на Рагачоўшчыне. Тату выпаў няпросты лёс. Яго, паспяховага вайскоўца-камісара асобнага батальёна сувязі, летам 1938 года, як і многіх іншых вайскоўцаў, «накрылі» сталінскія рэпрэсіі. Не здабыўшы «выбіваемых» паказанняў, у сакавіку 1939 года НКУС выпусціў яго на волю. Маці з дзецьмі (мне было 13 гадоў, брату — 6 месяцаў) пасялілася ў Рагачове, куды бацька прыехаў да нас. З таго часу яго лёс, як і лёс усёй сям'і, цесна звязаны з Рагачоўшчынай.**



Бацьку ў Чырвоную Армію не вярнулі, спасылаліся на здароўе. Праз два гады пачалася Вялікая Айчынная вайна. У той дзень — 22 чэрвеня 1941 года — тата, як загартаваны вайсковец, які не здымаў афіцэрскую форму ўсе даваенныя гады, адразу ж пайшоў у ваенкамат. Але ў армію яго не прызвалі, а направілі ў распараджэнне райкама партыі, які пачаў займацца арганізацыяй знішчальнага батальёна і падполля на выпадак акупацыі раёна ворагам.

3 ліпеня нямецка-фашысцкія войскі занялі Рагачоў і ўсю правую ад Дняпра частку раёна. Абарону левага берага ракі трымаў 63-і стралковы корпус 21-й арміі пад камандаваннем Пятроўскага. Некалькі дзён запар немцы спрабавалі фарсіраваць Днепр, але былі адбіты нашымі войскамі.

У гэтыя дні раённыя ўлады, якія размясціліся ў дзесяці кіламетрах ад Рагачова, заняліся фарміраваннем знішчальнага батальёна. У апалчэнне ўвайшло 120 байцоў — мясцовых добраахвотнікаў. Камандзірам батальёна ўлады абралі Мікалая Калінковіча як адзінага з раённай «эліты», хто меў добрую вайсковую падрыхтоўку.

Спакойна пасядзець у Рагачове акупантам давялося нядоўга. 13 ліпеня корпус Пятроўскага пачаў знакаміты Першы контрудар, адкінуўшы ворагаў ад Рагачова і Жлобіна да Бабруйска на 30 кіламетраў. У гэтай аперацыі ўдзельнічаў і знішчальны батальён на чале з Калінковічам. Аб гэтым ён паведаміў маці, калі праведваў нас у мястэчку Гарадзец (туды ён перавёз жонку і дзяцей, падалей ад небяспекі).

У той дзень мне, падлетку, бацька глыбока «ўрэзаўся» ў памяць як мужны камісар з аповесцей Гайдара, якімі мы, падлеткі даваеннага часу, зачытваліся. Ён быў апрануты па-армейску: гімнасцёрка, падпаясаная шырокім скураным рэменем, галіфэ, хромавыя боты, фуражка з зорачкай, а на баку — знакаміты пісталет-маўзер у драўлянай кабуры. Падчас сямейнай размовы ён расказаў, як перапраўліліся цераз Днепр, як застрэліў аднаго фрыца ў акопе.

Ва ўсіх партызанскіх аперацыях бацька быў наперадзе, натхняючы іншых. 15 ліпеня ён з 31 байцом батальёна перайшоў лінію фронту ў тыл ворага для разведкі і мініравання. Сабраная інфармацыя была перададзена камандаванню корпуса Пятроўскага.

26 ліпеня партызанам удалося вывесці з акружэння 700 армейскіх байцоў і 2000 савецкіх грамадзян прызыўнога ўзросту. 28 ліпеня нашы хлопцы на чале з Калінковічам наладзілі засаду і забілі 8 фрыцаў, страціўшы, на жаль, трох сваіх байцоў, а таксама падарвалі 8 мастоў.

У першыя дні жніўня 1941 года бацька зноў завітаў у Гарадзец і паабяцаў, што сходзіць на заданне, а потым адправіць нас з мамай у тыл. Але з гэтага задання ён не вярнуўся. У сярэдзіне жніўня нямецкія войскі, прарваўшы фронт, занялі ўсю тэрыторыю Рагачоўскага раёна. Наша сям'я апынулася пад акупацыяй, нічога не ведала аб лёсе любімага бацькі і мужа.

Толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны мне пашчасціла знайсці былога партызана 8-й Рагачоўскай брыгады, спадара Бірукова. Ён паведаміў, што партызанская група Калінковіча ноччу выходзіла з-за лініі фронту і ў лесе заблудзіла. Блукаючы доўгі час, партызаны выйшлі да нейкай вёскі. Калінковіч з двума байцамі пайшлі на разведку. Немцы, што былі ў вёсцы, адкрылі з кулямёта агонь і ўсіх трох скасілі кулямі. Астатнія байцы, застаўшыся без камандзіра, разбегліся хто куды. У месца дыслакацыі вярнулася толькі 9 з іх.

Трагедыя здарылася, як лічыў Бірукоў, дзесьці ў раёне Забуднянскіх хутароў Быхаўскага раёна ля мяжы з Рагачоўскім. Не пакідае надзея, што, дзякуючы гэтаму артыкулу, пашчасціць знайсці сведку гібелі трох партызан ці месца іх пахавання.

**Леанід КАЛІНКОВІЧ,**
*г. Мінск*

*Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

■ Мама, пачытай!

## Ручаёк і дуб

Той дзень выдаўся дужа спякотным. Прахалоды не было нават у цяньку. Хіба што пад дубам?

Да яго на лясную паляну любілі прыходзіць дзікі, каб паласавацца леташнімі жалудамі, прыбягалі казулі — на вадапой.

Тут жа, на паляне, уцякаючы ад лісы, апынуўся неяк і шэры зайка. Ад страху ён не адразу і пачуў, што побач звініць ручаёк. Але ж потым нахіліўся да яго, каб напіцца, каб наталіць сваю смагу...

Толькі дзе там! «Ты мне ніхто, не сябар, — зафыркаў ручаёк, — не чапай мяне, не пі вады!»

Пыркі сталі пераліваіцца ў сонечных промнях — утвараць вясёлку, але яна нікога не весяліла...

Вось і надумаліся лясныя жыхары правучыць фанабэрысты ручаёк: не сябраваць з ім, не размаўляць.

Той толькі пасмяяўся. Сказаў: «А куды вы падзенецеся?» Ён нават хацеў давесці гэта рамонку, які рос паблізу. Але той адвярнуў ад яго сваю прыгожую галоўку...

Так мінуў цэлы тыдзень!..

Засумаваў ручаёк. Яго халодная вада не бруіла больш па каменьчыках, не спявала песень...

Магутны дуб, бачачы гэта, многае мог бы сказаць. Але ён быў мудры і хацеў, каб ручаёк сам зразумеў сваю памылку.

**Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,**
*в. Магільна, Уздзенскі раён*

## Прыкметы восені

Маленькі зайчык Сцёпка сядзеў пад кустом і глядзеў па баках са страхам.

— Зайчаня, што з табой? — спытала сінічка Наташка з галінкі рабіны.

— А ты не бачыш? Нешта ў лесе страшнае адбываецца. Думаю, што гэта злы чараўнік хоча наш цудоўны лес зачараваць.

— Я нічога страшнага не заўважаю, — чырыкнула сінічка.

— Ці не заўважаеш, што сонейка пачало пазней па раніцах узыходзіць, стала халадней, вецер халодны дзьме, дажджы частыя? Не заўважаеш, што лісточкі на некаторых дрэвах сталі жоўтымі, аранжавымі, чырвонымі? А з некаторых дрэў яны і зусім абляцелі?! Бачыш, птушкі кудысьці ляцяць, вавёрачкі каморы запаўняюць ягадамі, грыбамі, арэхамі. Усё гэта нездарма.

— Дурненькі ты, — засмяялася сінічка. — Няма ў лесе ніякага злога чараўніка! Проста восень прыйшла. Восень — пара, калі ўсе рыхтуюцца да адпачынку. Дрэвы скідаюць лістоту. Некаторыя жывёлы, такія як вожыкі і мядзведзі, рыхтуюцца ўпасці ў спячку. Яны будуць спаць усю зіму да вясны.

— А птушкі? — спытаў зайчык.

— А птушкі ляцяць у вырай. Холадна і галадна ім зімой у нашых лясах.

— Сумная гэтая «восень»: лісце ападае, птушкі ляцяць, жывёлы спаць кладуцца, — знерваваўся зайка.

— А ты не сумуй, паглядзі навокал, колькі падарункаў нам яна прыгатавала: арэхі, грыбы, ягады. Хіба не стаў наш лес прыгожым у такім рознакаляровым строі?!

Паглядзеў Сцёпка вакол і зразумеў, што лес і сапраўды стаў прыгожы як ніколі. Добрая пара года — восень!

**Сям'я КЛАПАЦЮКОЎ,**
*Свіслацкі раён.*

## ЦЯГНІК ЗАБАЎ (для малечы)



### Лабірынт



### Знайдзіце 5 адрозненняў



### Народная забаўлянка



**Сарока-варона**
**кашу варыла,**
**дзетак карміла,**
**гэтаму – дала,**
**гэтаму – дала,**
**гэтаму – дала,**
**гэтаму – дала,**
**а гэтаму – не дала.**
**Ты самы малы,**
**вады не насіў,**
**дроў не калоў,**
**круп не малоў.**
**Бяжы да**
**крыніцы,**
**прынясі вадзіцы,**
**усім нам напіцца –**
**тады дам табе**
**кашы.**
**Тут пень, тут калода,**
**тут мох, тут балота,**
**а тутака крыніца –**
**сцюдзёна вадзіца**
**пацякла-пацякла-**
**пацякла!**

### 3D-малюнак



Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.

*Людзі кажуць:* ***«ЗГОДА БУДУЕ, НЯЗГОДА РУЙНУЕ».***

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.**

■ Напярэдадні старту

Ігар СІВАДЗЕДАЎ:

# «ХОЧАМ ВЯРНУЦЬ БЫЛЫЯ ПАЗІЦЫІ»

## Галоўны трэнер нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы пра тое, чаго чакаць заўзятарам ад выступлення нашых атлетаў



**22 жніўня ў Пекіне стартуе чарговы чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы. Беларусь на найбуйнейшых спаборніцтвах будзе прадстаўлена 18 спартсменамі. Хоць склад і не вялікі, але ў ім сабраны найлепшыя атлеты краіны, якія здольныя паказаць высокія вынікі. Планетарнае першынство стане апошняй маштабнай праверкай перад галоўным стартам чатырохгоддзя — Алімпіядай у Бразіліі. Напярэдадні галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Ігар СІВАДЗЕДАЎ распавёў карэспандэнту «Звязды» пра патэнцыял нашых спартсменаў, праблемы сусветнай і айчыннай лёгкай атлетыкі і пра тое, ці здольна наша краіна ў найбліжэйшай будучыні прыняць такі чэмпіянат.**

— Кантрольным стартам перад планетарным першынством у Пекіне стаў адкрыты чэмпіянат Беларусі, які нядаўна прайшоў у Гродне. Для многіх ён жа з'яўляўся апошнім этапам падрыхтоўкі і магчымасцю адабрацца на чэмпіянат свету ў Кітай. Таму для ўсіх нашых спартсменаў важна было паказаць добры вынік. Для тых, хто не выканаў адборачныя нарматывы, трэба было іх выконваць, а для тых, у каго яны меліся, пацвердзіць свой узровень гатоўнасці.

**Наша задача сёння, у першую чаргу, папулярызаваць спорт і вяртаць былыя пазіцыі ў лёгкай атлетыцы.**

***— Ці былі для вас нечаканасці на чэмпіянаце краіны?***

— Варта адзначыць, што ў Гродне былі паказаны шэраг высокіх вынікаў. Адным з сюрпрызаў стала выступленне скакуна ў даўжыню Канстанціна Барычэўскага, ён «паляцеў» на 8 метраў 22 см. Хоць гэты вынік і быў паказаны з невялікім спадарожным ветрам, які перавышаў устаноўленую норму, усё роўна узровень вельмі прыстойны, з ім можна прэтэндаваць на высокія месцы чэмпіянату свету. Добра зарэкамендавалі сябе ў скачках у даўжыню дзяўчаты — Анастасія Міронцык-Іванова і Вольга Сударава. Адчуваецца, што яны абедзве яшчэ маюць рэзерв і могуць палепшыць свой вынік. Выдатныя секунды ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі ў Аліны Талай. Нягледзячы на тое, што канкурэнцыі ў краіне ў яе пакуль няма, Аліна паказала вынік 12,74, гэта ўсяго на 0,04 сек. горш за яе асабісты рэкорд. Так хутка на чэмпіянатах краіны яна яшчэ ніколі не бегала, таму ёсць упэўненасць, што ў Пекіне Аліна можа прабегчы на ўзроўні свайго найлепшага часу.

Добрыя вынікі паказалі штурхальніцы ядра Алёна Дубіцкая (18,88 м) і Юлія Леанцюк (18,60 м). У кіданні кап'я ўпэўненую перамогу атрымала Таццяна Халадовіч, якая апошнім часам выступае стабільна. Гэта, на мой погляд, дазваляе спадзявацца на поспех у Пекіне. Цікавая барацьба завязалася ў кіданні молата ў мужчын, у апошняй спробе Павел Барэйша (76,06 м) вырваў перамогу ў Юрыя Шаюнова (75,36 м).

***— Напэўна, не абышлося і без расчараванняў?***

— Вядома, мы разлічвалі на Яну Максімаву ў мнагабор'і, якая павінна была на чэмпіянаце Беларусі паказваць свой вынік, чакалі пападання ў нацыянальную каманду ад Кацярыны Паплаўскай у бегу на 100 метраў з бар'ерамі, але на жаль, дзяўчаты не змаглі праявіць сябе, выканаць адборачныя нарматывы.

«Правалiўся» Уладзімір Казлоў, перспектыўны спартсмен, не змог кінуць кап'ё на патрэбныя для пуцёўкі ў Пекін 82 метры. Але затое праз два тыдні на спаборніцтвах у Мінску кінуў на 82,78 м, выканаў нарматыў, але было ўжо позна. Неабходна кідаць далёка ў патрэбным месцы і ў патрэбны час. Спадзяваліся мы на дзяўчат у скачках Ксенію Дзяцук і Наталлю Вяткіну. Яны, на жаль, не змаглі скокнуць на чэмпіянаце на 14,20 м. Адкрыта расчаравалі іх калегі — мужчыны Дзмітрый Платніцкі (15,71 м) і Аляксей Цапік (15,20 м). Паказаныя імі вынікі не вытрымліваюць ніякай крытыкі.

***— Якія задачы ставіць Міністэрства спорту і федэрацыя лёгкай атлетыкі перад камандай?***

— У праграме развіцця лёгкай атлетыкі на 4 гады прапісаны планавыя задачы, якія прадугледжваюць заваяванне аднаго-двух медалёў у Кітаі, але гэта не самамэта. Чэмпіянат свету ў Пекіне — гэта адзін з апошніх буйных афіцыйных міжнародных стартаў перад Алімпійскімі гульнямі. Менавіта тут мы зможам аб'ектыўна ацаніць выступленне нашых спартсменаў, іх здольнасць паказваць запланаваныя вынікі ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, складаных умовах надвор'я і часавай розніцы.

Таму галоўная мэта беларускіх атлетаў на гэтым чэмпіянаце — паказаць запланаваныя вынікі, пры гэтым праявіць характар і ўменне змагацца з наймацнейшымі атлетамі свету. Асноўным паказчыкам, акрамя медалёў, для нас будзе пападанне спартсменаў у 8-ку наймацнейшых. Мы разлічваем, што яго змогуць дасягнуць не менш за 5 членаў зборнай.

***— Розныя часавыя паясы, клімат і іншыя абставіны могуць умяшацца і паўплываць на выступленне нашых спартсменаў?***

— Калі ты моцны і добра гатовы, табе нічога не перашкодзіць: ні спякота, ні вільготнасць, ні розніца ў часе. У Пекін паехалі найлепшыя спартсмены краіны, ні ад аднаго з іх не чую, што сама пуцёўка на чэмпіянат свету — гэта ўжо дасягненне мэты: усе разумеюць, што там сябе трэба зарэкамендаваць, паказаць вынік, каб не было сорамна перад камандай і заўзятарамі. Мы верым, што ўсё так і будзе, усе будуць змагацца да канца ў імя дасягнення пастаўленай мэты.

Я разумею, што на спаборніцтвах у спартсменаў бываюць і няўдачы, паразы. Магчыма, яны здарацца ў кагосьці і ў Пекіне, але вельмі хочацца, каб напярэдадні Алімпіяды ўражанні ад чэмпіянату свету ў заўзятараў засталіся яркімі, напоўненымі станоўчымі эмоцыямі.

***— Раскажыце пра вяртанне ў сектар Івана Ціхана, у якіх ён знаходзіцца кандыцыях?***

— Я ўпэўнены, што Іван будзе змагацца за самыя высокія месцы, гэта не той спартсмен, які паедзе адбываць нумар. Узровень яго сённяшняй гатоўнасці дазваляе разлічваць на месцы ад 3-га па 6-е. Нават калі Ціхан падымецца на 6-ты радок пасля столькіх гадоў адсутнасці спаборніцкай практыкі — гэта будзе поспех. Вядома, яму прыйдзецца цяжкавата, але Іван — вопытны баец, ён матываваны і поўны жадання паказаць, на што здольны. Зноў-такі Пекін — гэта не галоўны старт для яго сёння, гэта прыступка, трамплін, калі хочаце, перад Алімпійскімі гульнямі.

***— Андрэй Краўчанка прапусціць чэмпіянат свету, хоць вясной гэтага ў планах не было?***

— Пасля таго, як яму зрабілі аперацыю, мы не тое, каб планавалі, а былі ўпэўнены, і ўрачы гэта пацвердзілі, што з мая ўжо можна нармальна трэніравацца, а летам выступаць на спаборніцтвах. Але, на жаль, гэтага не адбылося, таму пакуль лечымся і трэніруемся паралельна. Упэўнены, што мы справімся з траўмай і ўжо з восені пачнём падрыхтоўку да Алімпіяды для выступлення ў Рыа-дэ-Жанейра. На сёння галоўнае — вылечыць траўму.

***— Чаго чакаць беларускім заўзятарам ад прадстаўнікоў бегавых дысцыплін на чэмпіянаце свету?***

— Калі казаць пра спрынт, то там, на дыстанцыі 400 метраў, выступіць Аляксандр Ліннік, Аліна Талай — на 100 м з бар'ерамі, Марына Арзамасава і Святлана Кудзеліч — на доўгіх дыстанцыях. У кожнага стаяць свае задачы. Аляксандр павінен трапляць у паўфінал, але хочацца, вядома, каб ён яшчэ раз па-добраму здзівіў нас усіх. Ад Аліны Талай мы, вядома, чакаем асабістага рэкорду. Не будзем шмат казаць пра кожнага індывідуальна, каб лішні раз не турбаваць псіхіку атлетаў, скажу толькі адно: тое, на што здольны, яны пакажуць. Для большасці добра трапіць у 8-ку наймацнейшых, для кагосьці ў лік 12. Паўтаруся, калі мы заваюем 5-6 месцаў у 8-цы, гэта будзе лічыцца добрым вынікам і тады на Алімпіядзе можна будзе казаць пра 2-3 медалі.

***— Пагаворым пра лёгкую атлетыку ўвогуле. Галоўнай праблемай на дадзены момант па-ранейшаму застаецца допінг?***


Сёння яны ўжо ў Пекіне.

— Так, вядома, зараз зроблены крокі па барацьбе з ім, праца па выяўленні спартсменаў, якія прымаюць забароненыя прэпараты, ідзе па поўнай праграме. У нас ёсць дамоўленасць з нацыянальным антыдопінгавым агенцтвам, згодна з якой мы праводзім спаборніцкія допінгтэсты на ўсіх рэспубліканскіх стартах, уключаючы юнацкія і юніёрскія першынствы. Арганізуем таксама і пазаспаборніцкія праверкі.

Вялікую ўвагу надаём правядзенню семінараў па праблемах допінгу, у якіх прымаюць удзел трэнеры і спартсмены. Але паверце, не ўсё так проста, бо нехта заўсёды хоча апынуцца хітрэйшым, перамагчы несумленна, ужыўшы забаронены сродак. Яны разлічваюць на тое, што не ва ўсіх возьмуць пробу, бо на гэта не хопіць грошай. Часам такое меркаванне праходзіць. Тым не менш вылічыць несумленных спартсменаў можна. Мы бачым, што вынік быў адзін і раптам рэзка пайшоў уверх, натуральна, узнікнуць падазрэнні. Такіх спартсменаў мы будзем правяраць асобна як на спаборніцтвах, так і пры падрыхтоўцы да іх. Зараз сусветная тэндэнцыя ў лёгкай атлетыцы накіравана на барацьбу з допінгам, нідзе гэтага не даруюць. Мы за сумленную барацьбу, робім акцэнт на распрацоўку правільных методык, якія, паверце, існуюць і без забароненых прэпаратаў. Проста трэба больш напружвацца, трэнеру праяўляць больш творчасці, а спартсмену працаваць, тады будзе вынік.

***— Ходзяць размовы пра тое, што Беларусь у будучыні хацела б прыняць чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы. Як вы думаеце, ці здольна на гэта наша краіна і ці ёсць шанцы?***

— Безумоўна, здольна. Толькі трэба пачынаць з меншага: юнацкія спаборніцтвы, чэмпіянаты еўрапейскага ўзроўню, моладзевыя першынствы. І так паступова выйсці на сусветны ўзровень. Чаму б і не? У Маскве ж правялі чэмпіянат свету. Трэба, вядома, разумець, наколькі гэта няпроста, канкурэнцыя будзе высокая, не мы адны жадаем прыняць спаборніцтвы такога ўзроўню. Але да гэтага трэба імкнуцца, і тады ўсё атрымаецца. Мы пачалі з малога, пастараліся якасна правесці чэмпіянат краіны, правесці так, як праводзяць буйныя міжнародныя спаборніцтвы. Па водгуках спецыялістаў, як айчынных, так і замежных, ён прайшоў на добрым узроўні. Вядома, былі заўвагі, але яны нязначныя.

Наогул, наша задача сёння, у першую чаргу, папулярызаваць спорт і вяртаць былыя пазіцыі ў лёгкай атлетыцы. Самае галоўнае, з чаго мы пачынаем працу, — гэта дзеці. Шукаем рэзерв, пачынаючы ад сельскай мясцовасці, раённых цэнтраў, абласных гарадоў, і спрабуем усё гэта ўвязаць у адну сістэму, у гэтым кірунку і ідзе праца федэрацыі сёння. З прыходам Вадзіма Дзевятоўскага шмат што змянілася ў лепшы бок, не люблю раздаваць пахвалы, але гэты чалавек робіць для лёгкай атлетыкі столькі, што нават уявіць складана. Пачынаючы ад дзіцячага спорту і заканчваючы арганізацыямі візітаў самых уплывовых людзей у сусветнай лёгкай атлетыцы. З яго прыходам у спартсменаў з'явілася вялікая падтрымка, як маральная, так і фінансавая. І самае галоўнае — атлеты паверылі ў сябе.

**Гутарыла Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Футбол

# У АДНЫМ КРОКУ

**У першым матчы плэй-оф Лігі чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ перамог сербскі «Партызан» (1:0).**

Зрэшты, многія сыходзяцца ў думцы, што менавіта сустрэча ў Белградзе, а не ў Барысаве, у якой перамог БАТЭ, будзе вызначальнай у супрацьстаянні беларускага і сербскага чэмпіёнаў.

Фота БЕЛТА.




Стадыён «Партызана» можа змясціць адначасова звыш 30 тысяч гледачоў. І можна толькі здагадвацца, якая шумавая падтрымка будзе забяспечана саперніку каманды Аляксандра Ермаковіча. Праўда, падобным барысаўчан не здзівіць. У еўракубках яны гулялі і пры большай аўдыторыі.

Што тычыцца барысаўскай гульні, яна прадказальна прадэманстравала, «Партызан» — сапернік сур'ёзны. Але і з ім можна гуляць і перамагаць. Забіць нашы суайчыннікі маглі яшчэ ў першай палове, але зрабілі гэта ў другой. За 15 хвілін да завяршэння сустрэчы Міхаіл Гардзейчук пасля перадачы Ігара Стасевіча адправіў мяч у сетку сербскіх варот.

— Ці задаволеныя вы вынікам матча? — спыталі журналісты пасля сустрэчы ў **Аляксандра ЕРМАКОВІЧА, галоўнага трэнера БАТЭ.**

— Не скажу, што моцна задаволены. Аднак лічу, што лік справядлівы. На яго каманды і нагулялі. А ці задаволены я, пакажа толькі матч у Белградзе.

**Галоўны трэнер «Партызана» Зоран МІЛІНКАВІЧ** пасля матчу адзначыў, што яго каманда была мацнейшая і толькі выдаленне Еўціча выратавала барысаўчан ад паражэння. У першым тайме «Партызан» быў мацней за барысаўчан. На жаль, у канцы першага тайма арбітр выдаліў нашага іграка. Я не ўпэўнены, што былі сапраўды важкія прычыны для чырвонай карткі. Удзесяцёх мы добра супрацьстаялі БАТЭ. Напэўна, ім было цяжка супраць нас гуляць. Тым не менш свой гол яны забілі.


Фота БЕЛТА.

Застаецца толькі дадаць, што паядынак у сталіцы Сербіі адбудзецца 26 жніўня і пачнецца ў 21:45.

**Якаў ЖУРБІН**

# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже земельного участка в частную собственность негосударственным юридическим лицам Республики Беларусь для строительства и обслуживания комплекса придорожного сервиса у автомобильной дороги М-1/Е-30 Брест (Козловичи) – Минск – граница Российской Федерации (Редьки) на 389 км (лево) Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком, зал заседаний, 24.09.2015 г. в 11.00 |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 4,9904 га, кадастровый номер 624800000001001046 у автомобильной дороги М-1/Е-30 Брест (Козловичи) – Минск – граница Российской Федерации (Редьки) на 389 км (лево) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Лот № 1 – строительства и обслуживания комплекса придорожного сервиса |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 3 000 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть негосударственные юридические лица Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот № 1 – подъездная дорога |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области р/с 3600627000007, УНП 6000537220, код банка 153001812 ЦБУ 621 филиала 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком** | Каждый четверг с 9.00 до 13.00 |

**Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений 18 сентября 2015 г.**

**Контактный телефон (8-01776) 55-3-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:**

- заявление на участие в аукционе;

- документ подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

- представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1.<br>**Косилка КРД-1.5, 2008 г.в., инв. 41248, начальная стоимость лота 58 545 000 рублей.**<br>Лот №2.<br>**Полуприцеп ПТС-9, 2009 г.в., гос. номер БЯ 0334, начальная стоимость лота 44 206 000 рублей.**<br>Лот №3.<br>**Полуприцеп ПТУ-7,5, 2008 г.в., гос. номер БЯ 0331, начальная стоимость лота 20 044 000 рублей.**<br>Лот №4.<br>**Полуприцеп ПТУ-7,5, 2008 г.в., гос. номер БЯ 0385, начальная стоимость лота 20 044 000 рублей.**<br>Лот №5.<br>**Экскаватор-погрузчик ЭП-2620, 2005 г.в., гос. номер ВА 7781, начальная стоимость лота 116 948 000 рублей.**<br>Лот №6.<br>**Трактор «Беларус 82.1», 2008 г.в., гос. номер БЯ 3744, начальная стоимость лота 83 500 000 рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | КУП «Верхнедвинское ПМС» (г. Верхнедвинск, ул. Советская, 173, УНП 300437213), тел. (02151) 5-34-73 |
| **Местонахождение имущества** | г. Верхнедвинск, ул. Советская, 173 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 323<br>3 сентября 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 323<br>Судебный исполнитель<br>Деревнин Сергей Евгеньевич, тел. (0212) 60 09 09<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
